ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 27 (2284)
2 красавіка 1968 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

У БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ-ГЕРОІ

Далёка адзін ад аднаго Краснадар і Нарыльск. Але ў дні школьных канікулаў вучням гэтых гарадоў давялося сустрэцца. Месцам іх знаёмства стала Брэсцкая крэпасць-герой, куды яны прыехалі на экскурсію. Са школьнікамі з Краснадара прыехаў іх зямляк, удзельнік абароны крэпасці Герой Савецкага Саюза Пётр Міхайлавіч Гаўрылаў. Ён і быў гідам вучняў, паказваў ім месцы баёў. Усходні форт, абаронай якога кіраваў. Каля вечнага агню адбылося ўскладанне вянкоў.

На здымку — П. Гаўрылаў (крайні злева) з экскурсіяй школьнікаў у Брэсцкай крэпасці.

Фота В. ГЕРМАНА. (БЕЛТА).

ПІСЬМЕННІК, ТРЫБУН, ГУМАНІСТ

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭННЕ Ў КРАМЛЁЎСКІМ ПАЛАЦЫ З'ЕЗДАЎ, ПРЫСВЕЧАНАЕ 100-ГОДДЗЮ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ А. М. ГОРКАГА

Сёння, у дні юбілею вялікага пралетарскага пісьменніка Максіма Горкага, успамінаюцца яго словы: «Мая радасць і гонар — новы рускі чалавек, будаўнік новай дзяржавы». І гэты новы чалавек, Чалавек з вялікай літары, адзначае дзень нараджэння Максіма Горкага, як свой уласны. Усюды прайшлі вечары яго памяці, выстаўкі, прэм'еры горкаўскіх п'ес. Данінай глыбокай павагі савецкіх людзей сталі вянкі і кветкі, прынесеныя да помнікаў пісьменніку, на яго магілу. Ва ўсіх кутках нашай Радзімы людзі сардэчна і з удзячнасцю думаюць пра яго. Горкі і сёння з намі — ён слава і гонар нашай краіны.

Вянцом усенароднага святкавання 100-годдзя з дня нараджэння А. М. Горкага стала ўрачыстае пасяджэнне ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў. 28 сакавіка сюды прыйшлі пісьменнікі і грамадскія дзеячы, майстры мастацтваў і партыйныя работнікі, перадавікі вытворчасці прадпрыемстваў сталіцы і лепшыя людзі падмаскоўных гаспадарак, госці сталіцы.

Над сцэнай — вялікі партрэт Горкага і даты: 1868—1968.

Прывітальнымі воплескамі сустракаюць прысутныя паяўленне ў прэзідыуме таварышаў Л. І. Брэжнева, Г. І. Воранава, А. П. Кірыленкі, А. М. Касыгіна, К. Т. Мазурава, М. В. Падгорнага, Д. С. Палянскага, А. М. Шалепіна, В. В. Грышына, П. Н. Дзямічава, І. В. Капітонава, Ф. Д. Кулакова, Б. М. Панамарова, М. С. Саломенцава, а таксама членаў Усесаюзнага юбілейнага камітэта.

Перш чым адкрыць урачыстае пасяджэнне, першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР **К. А. Федзін** гаворыць:

— У гэты светлы вясновы дзень на нашу зямлю прыйшоў смутак. Загінулі Героі Савецкага Саюза першы ў свеце лётчык-касманаўт Юрый Аляксеевіч Гагарын і інжынер-палкоўнік Уладзімір Сяргеевіч Сярогін. Юрый Аляксеевіч Гагарын хацеў выступіць сёння на нашым урачыстым сходзе. Прапаную ўшанаваць памяць слаўных сыноў Савецкай Радзімы ўставаннем.

Зала ўстае...

К. А. Федзін гаворыць уступную прамову.

— Споўнілася сто гадоў з дня нараджэння Аляксея Максімавіча Горкага, — сказаў ён. — Гэта святочная гадавіна цяпер опалучаецца, як суквецце, з другой: семдзесят пяць гадоў назад на радзіме пісьменніка, у Ніжнім Ноўгарадзе, газета «Волгарь» надрукавала першы волгук аб першым апавяданні Горкага. І тады тут, над роднай Волгай, узмахнула крылом маладая слава Горкага. Адсюль яна паляцела, каб, з незвычайнай хуткасцю праляцеўшы рубяжы земляў і вод, ператварыцца ў славу сусветную.

Яе называлі казкай — гэту дзівосную славу. І яна была казкай, таму што малажкі яе даносілі дзівосны заклік пісьменніка — зрабіць жыццё цудоўным.

З заклікам сваім яшчэ ўчора невядомы мастак звяртаўся да людзей, якія не мелі ні багацця, ні магутнасці, да людзей, пазбаўленых хоць якой-небудзь адукацыі, часцей — непісьменных, забітых нэндзаю, прыгнечаных бязмернай і беспрасветнай працай. Іх заклікаў ён распраміцца, у іх абуджаў гордасць чалавека.

Ці маглі яны паверыць яго заклікам, яны, большасць якіх страцілі надзею на лепшую долю? Горкі ведаў, што гаварыў: са сваіх ранніх гадоў ён ішоў цяжкімі сцежкамі жыцця і паспеў зведаць яго да дна. Ён зведаў сілу мары, якая тоіцца ў чалавеку нават на парозе роспачы. Як глыбокі мастак, ён ведаў уладу фантазіі. Ён не пераставаў узвялічваць народныя паданні, легенды, быліны. Любоў да іх народа пераконвала яго, што казка павінна ўсяляць у чалавека не толькі адно любаванне ёю, але і веру ў магчымасць цудоўнага жыцця на зямлі.

У такой перакананасці Горкага нараджалася ўсё казачнае яго кніг, нарадзіліся і славутыя песні — пра Сокала, пра Буравесніка. Па-былінаму трывожныя — песні гэтыя поўныя гатоўнасці да бою. У іх настолькі абагульнены вобразы, што самі героі-птушкі, узняўшыся над светам, былі ўсюды ўспрыняты як сімвалы і засталіся імі назаўсёды.

Горкі ўзняў сваё жыццё з народных нізін, якія палохалі мешчаніна, і птушкаю ўзляцеў над імі— вось што здзіўляла менавіта гэтага мешчаніна. І вось чаму чуткі ў Расіі і ва ўсім свеце спачатку крупіліся вакол легендарнасці з'явы, вакол дзівоснага казачніка з паволжскіх бурлакоў або трузчыкаў.

Але сапраўднае дзіва было ў тым, што летуценнік Горкі быў сапраўдны рэаліст. Казкі ён расказваў, не перастаючы думаць — як жа іх перанесці ў жыццё? Клікаць людзей да цудоўнага, не ведаючы да яго шляхоў, — ці варта гэта мастака? Хто будзе будаваць новы свет? Хто пакорліва саступіць яму месца ў старым? Хто вымушаны разбурыць стары? Жыццё цвяроза адказвала — хто і як складзе барацьбу, на якую склікалі народ песенныя птахі. Горкі з маладосці ўсё бліжэй і глыбей пазнаваў людзей рэвалюцыі, сярод іх — і будучых марксістаў. Яму даводзілася вучыцца ў гуртках рабочай моладзі, для якой ключы да партыйнага падполля не заўсёды былі сакрэтам. Юнак Горкі пешшу пайшоў па Расіі, каб зведаць яе, і выйшаў на гістарычную дарогу нашай краіны — на дарогу рэвалюцыянера.

Тады, на пераломе двух стагоддзяў, свет рэзка раскалоўся для пісьменніка на сяброў і ворагаў. Рэакцыя пераканалася і ўпэўнілася ў «шкодлівасці» горкаўскіх твораў для існуючага ладу. Царскія ўлады вышуквалі ў дзейнасці Горкага ўсё, што можна было пакараць. Немагчыма, вядома, узважыць, колькі душэўных сіл адабралі ў пісьменніка бясконцыя «адсідкі» ў паліцэйскіх участках, турмах, крэпасці, пад наглядам тайным або адкрытым, у арыштанцкіх дамах або пад хатнім арыштам. Тое, што за час усіх ганенняў Горкі не даў пахіснуцца мужнасці свайго чароўнага пяра, — гаворыць за веліч духа сапраўднага паэта.

Пагасіць голас Горкага станавілася калючай задачкай не адных саматужных рэакцыянераў. У разгар падзей рэвалюцыі 1905—1906 гг. у Расіі, якія знайшлі жывы водгук у Злучаных Штатах Амерыкі, вось што, напрыклад, «уталкоўваў» сваім суайчыннікам нейкі прадстаўнік вышэйшых афіцыйных колаў: «Прыслухоўваючыся да Горкага, амерыканскі народ павінен зразумець, што ён (Горкі) ніякі ні ліберал, ніякі не рэфарматар, а чысцейшы і сапраўдны рэвалюцыянер». І далей, агаварыўшыся, што Горкі, «несумненна, таленавіты пісьменнік, можа, нават геній...», амерыканец зноў асцерагаў: «...Аднак, трэба ясна ўразумець, што мэта яго (Горкага) — не рэформа, а рэвалюцыя...».

Якіх толькі варыяцый такіх перасцярог не набярэцца ў прэсе мноства краін за дзесяцігоддзі да смерці Горкага і пасля яе. Западохванне словам «рэвалюцыянер» павінна было засцерагчы ад спакусы горкаўскага закліку свет дабрамыснага буржуа. Але нельга было страхам адвесці ад Горкага апеты ім свет працы. Год у год на Захадзе і Усходзе расла бяспрыкладна вялікая колькасць яго чытачоў, якія рабіліся яго прыхільнікамі. І гэтак жа, як усё сваё жыццё Горкі чэрпаў натхненне ў вызваленчай барацьбе пралетарыята, гэтак жа, як ён навёчна зліў свой геній з магутнай энергіяй Вялікага Кастрычніка,— так у рэвалюцыі знаходзіў ён нязмерны запас сіл супраціўлення яе ворагам.

Горкі ніколі не быў і ніколі не будзе зломлены. Кнігі летуценніка і рэаліста дружалюбна вядуць нас у тую цудоўную будучыню, дзе — па яго слову — перамогуць творчыя сілы розуму і духоўнае здароўе чалавека.

У гэтым пераможным будучым, як і сёння, — гаворыць у заключэнне Канстанцін Федзін, — калі мы ўшаноўваем стагоддзе з дня нараджэння пісьменніка Аляксея Максімавіча Горкага, слава яго будзе лунаць высока над намі.

К. А. Федзін паведамляе, што на ўрачыстасці, прысвечаным 100-годдзю А. М. Горкага, прыехалі госці з Балгарыі, Вялікабрытаніі, Венгрыі, Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, Індыі, Канады, Мангольскай Народнай Рэспублікі, Пакістана, Польшчы, Румыніі, Францыі, Чэхаславакіі, Швейцарыі, Югаславіі, Японіі.

Зала вітае зарубежных гасцей.

Са словам пра Горкага выступае **Леанід Ляонаў.**

Сёння перадавая грамадскасць свету ўскладае мемарыяльны вянок пашаны і ўдзячнасці да падножжа Максіма Горкага. Гэта імя належыць несумненна буйнейшаму на сучасным гістарычным этапе ўладару дум і дзеячу культуры ў нашай краіне. Будучы толькі адным з рабочых патокаў у гэтым бясконца складаным, калі нават і **вынікавым** працэсе, літаратура тым не меней з'яўляецца жывой, аўтаномнай мышцай для лепкі душ чалавечых, ным і вызначаецца яе месца ў планаванні будучага.

Натуральна, што, адрозніваючыся па сіле ўздзеяння або якаснай трываласці, творы мастацтва маюць і розны лёс. Так ужо вядзецца, што штарташыні зямнога шара,—плячысты асілак з пароды няўрымслівых наўгародцаў, толькі родам з Ноўгарада-Ніжняга, што на Волзе, з той плеяды адборных валгароў, якіх, распляскаўшыся ў імклівым бегу, ледзь не аднымі прыгаршчамі вынесла разам з Леніным на бераг рака гісторыі нашай.

Высокае майстэрства гэта, складзенае, акрамя дабразычлівасці і тытанічнага цярпення, таксама з педагагічнага спрыту, якога нам, цяперашнім, так нестае, тлумачылася ў Горкага яго яўнай, напалавіну, прынамавы дзевяты вал пенай і шэптам гасне дзесьці на водмелі, мяцежныя Свіфт і Дэфо дабягаюць да нас у жанры дзіцячай казкі. Прайшоўшы праз фільтры эпох і пакаленняў, толькі чыстае золата даходзіць да самых аддаленых нашчадкаў... Хаця яшчэ і не наспела пара для канчатковай ацэнкі Горкага, але ўжо цяпер відаць, што з тройкі выдатных рускіх пісьменнікаў, якія разам з ім пераступілі рубеж стагоддзя, гэты майстар слова і жыцця калі не мацней, дык шырэй за іншых паўплываў на грамадскую думку свайго веку. Амаль роўныя па зададзенай патэнцыяльнай магутнасці, яны гранічна розняцца па характару свайго літаратурнага лёсу. Час пакажа, наколькі адаб'ецца, і ці адаб'ецца ўвогуле, ледзь не маланкавы ўздым горкаўскай славы на працягласць яе далейшага збегу.

З названай вялікай тройкі Горкі пакінуў нас пазней Чэхава і Талстога, і таму для майго пакалення вобраз яго захаваўся жывей за астатніх. У вушах нашых яшчэ гучыць яго глухаваты, трошкі окаючы басок з нязменным «ну-те-с» у канцы фразы, якім нібы запрашаў субяседніка на раўнапраўнае абмеркаванне ўзнятай тэмы; мы яшчэ зберагаем каштоўнае мускульнае адчуванне яго ўладнага, як пароль, поціску... Так ва ўяўленні нашым кожны раз паўстае строгі, высокага росту і як бы ад цяжару сабранага вопыту трохі сутулаваты чалавек, такі непазнавальна розны з ворагам і сябрам, не схільны ні да малейшага зговару за кошт сваіх пазіцый, часта нават у шкоду старому прыяцельству. Але гэты водбліск ігуменскай суровасці ў асабістай памяці маёй нязменна змякчаецца ўражаннем ласкавай уважлівасці ў спалучэнні з хітравата-пільнай прыглядкай да ўсякай навізны— аж проста да самых драбніц парою, бо жамчужыны вялікіх адкрыццяў любяць хавацца ў самай несамавітай абалоне. Заўсёды здзіўляла мяне, як многа **ўсяго** і **ўсякага** было ў Горкім, і перш за ўсё кідалася ў вочы якраз гэта прагнае горкаўскае шукальніцтва нечага незвычайнага ў людзях, у разліку на далейшы рух уперад—ці то не ўвасобленая ў формулу дзёрзкая навуковая ідэя, ці ледзь набрыялы парастак маладога даравання. Тыя, хто сустракаўся з ім, прыгадаюць сёння яго нястрымную радасць ад такіх знаходак, нібы гэта ён сам узбагачаўся імі. І сапраўды, кожная такая ўдача памнажала рацыі яго аднадумцаў, паплечнікаў у вечнай і няспынай бітве за нешта генеральнае, што выверана на ўласнай спіне, нешта самае святое на свеце, чаму ён даў прысягу вернасці на парозе свядомага жыцця. Уласна кажучы, ён і сам быў кожную хвіліну гатовы хоць зрабіць апашную **за гэтае самае...**

Я не бачу ніякага сэнсу марнаваць адведзены мне час на пералічэнне агульнавядомых твораў Горкага, — больш важна тое, што ўсе яны вытрыманы былі ў адным ключы. У тыя даўнія гады ўжо даспяваў вялікі план генеральнага пераворвання ўсяго жыцця, пры гэтым менавіта Горкі нібы браў на сябе падрыхтоўку кадраў для будучага, як яно ўяўлялася тады — адначасна паэтычнае і ўжо грознае, абумоўленае логікай сацыяльнай мэтазгоднасці, пабудаванае з цэлых лічбаў і хімічна чыстых элементаў, хай сабе яны і не часта сустракаюцца ў прыродзе, ва ўмовах амаль стэрыльных ад забруджванняў, што спадарожнічаюць усякаму жыццю, без статыстычных ухіленняў, якія намецілася пазней... Словам, як заўсёды і малявалася **яно** ў чарнавых накідах усіх самых высакародных мараў аб **праведным** жыцці, пачынаючы з утапістаў і нават пятнаццацю стагоддзямі раней. Такім чынам, зробленая Горкім работа дае падставы назваць яго не толькі вестуном гуманістычнай навізны, але і селекцыянерам больш якаснага, на перасеў планеты, адборнага людскога зерня — узамен таго, якім пакуль што, уперамешку з пустазеллем, засяна гаротная ніва чалавечая. Асаблівыя якасці — няўхільная валявая мэтанакіраванасць нароўні з палымянай перакананасцю і сканцэнтраванай маральнай сілай патрэбны для такой, уласна — найвышэйшай пасады на зямлі, бадай, нават прарочая вера ў чалавека.

Расказваючы пра сваю сустрэчу з Горкім вясной 1931 года ў Італіі, Л. М. Ляонаў прыгадвае думкі вялікага пісьменніка аб слове як матэрыяле, які ідзе на выбар «гуманістычнай зброі», аб дзекабрыстах, аб рэвалюцыйных дэмакратах, аб прыдворным драматургу Нестару Кукальніку; дае штрыхавы накід партрэта Горкага.

— Поруч са мною, — гаворыць прамоўца, —стаяў прызнаны арбітр асноўных чалавечых вартасцей і важак двух пакаленняў, што ішлі на штурм, — настаўнік, закліканы фармуляваць грамадзянскія запаветы веку і звяргаць манархаў, па ўсіх параметрах неахопнай асобы годны хоць заўтра ў старшыні зямнога шара,—плячысты асілак з пароды няўрымслівых наўгародцаў, толькі родам з Ноўгарада-Ніжняга, што на Волзе, з той плеяды адборных валгароў, якіх, распляскаўшыся ў імклівым бегу, ледзь не аднымі прыгаршчамі вынесла разам з Леніным на бераг рака гісторыі нашай.

Высокае майстэрства гэта, складзенае, акрамя дабразычлівасці і тытанічнага цярпення, таксама з педагагічнага спрыту, якога нам, цяперашнім, так нестае, тлумачылася ў Горкага яго яўнай, напалавіну, прынамавы дзевяты вал пенай і шэптам гасне дзесьці на водмелі, мяцежныя Свіфт і Дэфо дабягаюць да нас у жанры дзіцячай казкі. Прайшоўшы праз фільтры эпох і пакаленняў, толькі чыстае золата даходзіць да самых аддаленых нашчадкаў... Хаця яшчэ і не наспела пара для канчатковай ацэнкі Горкага, але ўжо цяпер відаць, што з тройкі выдатных рускіх пісьменнікаў, якія разам з ім пераступілі рубеж стагоддзя, гэты майстар слова і жыцця калі не мацней, дык шырэй за іншых паўплываў на грамадскую думку свайго веку. Амаль роўныя па зададзенай патэнцыяльнай магутнасці, яны гранічна розняцца па характару свайго літаратурнага лёсу. Час пакажа, наколькі адаб'ецца, і ці адаб'ецца ўвогуле, ледзь не маланкавы ўздым горкаўскай славы на працягласць яе далейшага збегу.

З названай вялікай тройкі Горкі пакінуў нас пазней Чэхава і Талстога, і таму для майго пакалення вобраз яго захаваўся жывей за астатніх. У вушах нашых яшчэ гучыць яго глухаваты, трошкі окаючы басок з нязменным «ну-те-с» у канцы фразы, якім нібы запрашаў субяседніка на раўнапраўнае абмеркаванне ўзнятай тэмы; мы яшчэ зберагаем каштоўнае мускульнае адчуванне яго ўладнага, як пароль, поціску... Так ва ўяўленні нашым кожны раз паўстае строгі, высокага росту і як бы ад цяжару сабранага вопыту трохі сутулаваты чалавек, такі непазнавальна розны з ворагам і сябрам, не схільны ні да малейшага зговару за кошт сваіх пазіцый, часта нават у шкоду старому прыяцельству. Але гэты водбліск ігуменскай суровасці ў асабістай памяці маёй нязменна змякчаецца ўражаннем ласкавай уважлівасці ў спалучэнні з хітравата-пільнай прыглядкай да ўсякай навізны— аж проста да самых драбніц парою, бо жамчужыны вялікіх адкрыццяў любяць хавацца ў самай несамавітай абалоне. Заўсёды здзіўляла мяне, як многа **ўсяго** і **ўсякага** было ў Горкім, і перш за ўсё кідалася ў вочы якраз гэта прагнае горкаўскае шукальніцтва нечага незвычайнага ў людзях, у разліку на далейшы рух уперад—ці то не ўвасобленая ў формулу дзёрзкая навуковая ідэя, ці ледзь набрыялы парастак маладога даравання. Тыя, хто сустракаўся з ім, прыгадаюць сёння яго нястрымную радасць ад такіх знаходак, нібы гэта ён сам узбагачаўся імі. І сапраўды, кожная такая ўдача памнажала рацыі яго аднадумцаў, паплечнікаў у вечнай і няспынай бітве за нешта генеральнае, што выверана на ўласнай спіне, нешта самае святое на свеце, чаму ён даў прысягу вернасці на парозе свядомага жыцця. Уласна кажучы, ён і сам быў кожную хвіліну гатовы хоць зрабіць апашную **за гэтае самае...**

Я не бачу ніякага сэнсу марнаваць адведзены мне час на пералічэнне агульнавядомых твораў Горкага, — больш важна тое, што ўсе яны вытрыманы былі ў адным ключы. У тыя даўнія гады ўжо даспяваў вялікі план генеральнага пераворвання ўсяго жыцця, пры гэтым менавіта Горкі нібы браў на сябе падрыхтоўку кадраў для будучага, як яно ўяўлялася тады — адначасна паэтычнае і ўжо грознае, абумоўленае логікай сацыяльнай мэтазгоднасці, пабудаванае з цэлых лічбаў і хімічна чыстых элементаў, хай сабе яны і не часта сустракаюцца ў прыродзе, ва ўмовах амаль стэрыльных ад забруджванняў, што спадарожнічаюць усякаму жыццю, без статыстычных ухіленняў, якія намецілася пазней... Словам, як заўсёды і малявалася **яно** ў чарнавых накідах усіх самых высакародных мараў аб **праведным** жыцці, пачынаючы з утапістаў і нават пятнаццацю стагоддзямі раней. Такім чынам, зробленая Горкім работа дае падставы назваць яго не толькі вестуном гуманістычнай навізны, але і селекцыянерам больш якаснага, на перасеў планеты, адборнага людскога зерня — узамен таго, якім пакуль што, уперамешку з пустазеллем, засяна гаротная ніва чалавечая. Асаблівыя якасці — няўхільная валявая мэтанакіраванасць нароўні з палымянай перакананасцю і сканцэнтраванай маральнай сілай патрэбны для такой, уласна — найвышэйшай пасады на зямлі, бадай, нават прарочая вера ў чалавека.

Расказваючы пра сваю сустрэчу з Горкім вясной 1931 года ў Італіі, Л. М. Ляонаў прыгадвае думкі вялікага пісьменніка аб слове як матэрыяле, які ідзе на выбар «гуманістычнай зброі», аб дзекабрыстах, аб рэвалюцыйных дэмакратах, аб прыдворным драматургу Нестару Кукальніку; дае штрыхавы накід партрэта Горкага.

— Поруч са мною, — гаворыць прамоўца, —стаяў прызнаны арбітр асноўных чалавечых вартасцей і важак двух пакаленняў, што ішлі на штурм, — настаўнік, закліканы фармуляваць грамадзянскія запаветы веку і звяргаць манархаў, па ўсіх параметрах неахопнай асобы годны хоць заўтра ў

ПРЫЁМ У КРАМЛІ

У сувязі са 100-годдзем з дня нараджэння вялікага пралетарскага пісьменніка А. М. Горкага 29 сакавіка ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў адбыўся прыём.

На прыёме былі таварышы Л. І. Брэжнеў, А. М. Касыгін, М. В. Падгорны, П. Н. Дзямічаў, старшыня Усесаюзнага юбілейнага камітэта, першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР К. А. Федзін, члены юбілейнага камітэта, сакратары праўлення Саюза пісьменнікаў, кіраўнікі міністэрстваў і цэнтральных устаноў, пісьменнікі, дзеячы мастацтва, журналісты, зарубежныя госці.

На прыёме выступіў Старшыня Савета Міністраў СССР А. М. Касыгін.

Прамова таварыша А. М. КАСЫГІНА

Дарагія таварышы і сябры, паважаныя госці!

Наш народ, усе перадавыя людзі планеты адзначаюць стагоддзе з дня нараджэння вялікага рускага пісьменніка, Буравесніка рэвалюцыі — Аляксея Максімавіча Горкага.

Мастак сусветнай вядомасці, уклад якога ў культуру чалавецтва сапраўды велізарны, Горкі — слава і гордасць нашай Радзімы, Ён дарагі нам як вялікі пісьменнік, пісьменнік - рэвалюцыянер, які паклаў пачатак пралетарскай, сацыялістычнай літаратуры.

Яго творчасць неадзельная ад гісторыі вызваленчай барацьбы пралетарыяту Расіі, ад перамогі Вялікага Кастрычніка, 50-годдзе якой нядаўна мы ўрачыста адзначалі.

Сведка і ўдзельнік вялікіх класавых баёў, Горкі аддаў увесь свой магутны талент справе працоўнага народа. З велізарнай мастацкай сілай паказаў ён гістарычны подзвіг рэвалюцыйнага народа, ленінскай партыі бальшавікоў. Выдатны выразнік сваёй эпохі — эпохі пралетарскай сацыялістычнай рэвалюцыі —Горкі быў дастойным прадаўжальнікам высакародных грамадзянскіх традыцый рускай літаратуры, якая дала свету такіх геніяў, як Пушкін і Гогаль, Лермантаў і Некрасаў, Чарнышэўскі і Дабралюбаў, Талстой і Чэхаў.

Вялікі пралетарскі пісьменнік пастаянна адчуваў мудрую і сяброўскую падтрымку Уладзіміра Ільіча Леніна, вучыўся ў яго, звяраў па Леніну свой жыццёвы і творчы шлях.

Яго магутны мастацкі талент расцвіў, заззяў шматколернасцю адшліфаваных граней іменна дзякуючы таму, што ён усю сваю творчасць звязаў з народам, са справай рабочага класа, з пралетарскай рэвалюцыяй і сацыялізмам, са справай вялікага Леніна.

Дарагія таварышы! Ідзе час, але не гаснуць у свядомасці народа вялікія творы Горкага — яны паранейшаму запальваюць сэрцы савецкіх людзей рэвалюцыйным пафасам, энергіяй стварэння, дапамагаюць нам жыць і працаваць, паспяхова ісці ўперад па шляху будаўніцтва камунізма.

Вялікі гуманіст і інтэрнацыяналіст, Горкі быў палымяным патрыётам сваёй краіны. Ён ганарыўся тым, што яго народ першым пайшоў на шляху, указанаму Леніным, стаўшы прыкладам і надзеяй працоўных усяго свету.

На ўсю планету гучыць голас вялікага пісьменніка ў абарону радзімы сацыялізма, у абарону рэвалюцыйных заваёў савецкага народа.

Горкі заклікаў прагрэсіўную грамадскасць свету згуртоўвацца для адпору і наступлення супраць імперыялістычнай рэакцыі і фашызму.

Мы не раз гаварылі і гаворым, што ўсім нам памятны яго палымяны заклік да дзеячаў літаратуры і мастацтва, калі ён спытаў: «З кім вы, «майстры культуры»?» Гэты заклік і сёння гучыць у свеце як заклік да барацьбы супраць тых жа сіл, пра якія гаварыў Горкі. І прагрэсіўныя майстры культуры, за якімі несумненна працоўны народ і будучыня чалавецтва, адказваюць, што яны за справу Леніна, за справу вялікай Камуністычнай партыі, за працоўны народ, за інтэрнацыяналізм.

Горкаму давялося стаць умелым і клапатлівым арганізатарам шматнацыянальнай савецкай літаратуры. Да яго, гэтай яркай і дзівоснай асобы, цягнуліся ўсе лепшыя розумы, усе таленавітыя людзі, і ён няспынна згуртоўваў іх, вучыў сумленнаму, беззапаветнаму служэнню інтарэсам народа, ідэалам камунізма.

Нам дарагія выдатныя традыцыі Горкага-мастака, Горкага-грамадзяніна і змагара. Яны сёння заклікаюць майстроў культуры да выразнага ўсведамлення адказнасці ва лёс роднай краіны, за камуністычнае выхаванне працоўных. Яны вучаць праяўляць у вялікім і малым ідэйную прынцыповасць, цвёрда адстойваць інтарэсы нашага народа, гонар і годнасць сацыялістычнай Радзімы, вялікую справу барацьбы ўсіх народаў за свабоду, за мір, за сацыялізм.

У гэты дзень урачыстага юбілею вялікага пісьменніка рускага народа дазвольце, таварышы, пажадаць нашым пісьменнікам, усім работнікам савецкай культуры новых творчых дасягненняў!

За рэвалюцыйныя, горкаўскія традыцыі ў савецкай літаратуры!

За новыя поспехі ў камуністычным будаўніцтве!

К. А. Федзін у выступленні ў адказ падзякаваў Цэнтральнаму Камітэту КПСС і Савецкаму ўраду за вялікую ўвагу, якая аказваецца ў нашай краіне развіццю літаратуры, за клопаты аб пісьменніках, дзеячах культуры і мастацтва. Ад імя юбілейнага камітэта ён выказаў сардэчную ўдзячнасць замежным гасцям, якія прыбылі ў Маскву для ўдзелу ў святкаванні 100-годдзя з дня нараджэння А. М. Горкага.

ТАСС.

ГЕРОЯМ ЖЫЦЬ ВЕЧНА

Масква. 30 сакавіка 1968 года. Пахаванне лётчыка-касманаўта СССР Героя Савецкага Саюза Ю. А. Гагарына і Героя Савецкага Саюза інжынер-палкоўніка У. С. Сярогіна. Жалобны мітынг на Краснай плошчы.

Есць людзі, на долю якіх выпала зайздросная і разам з тым неймаверна цяжкая доля першаадкрывальнікаў. Чалавецтва свята шануе іх імёны: Магелан, Калумб, Капернік, Ньютан, Эйнштэйн... і —Юрый Гагарын. Касмічны першапраходца. Сын Зямлі, які ўпершыню адправіўся па нязведаным шляху ў бязмежныя прасторы Сусвету і сваім адважным подзвігам адкрыў эру пакарэння космасу...

Якімі ж словамі перадаць смутак, што ахапіў кожнага савецкага чалавека, нашых сяброў ва ўсім свеце, калі светлым сакавіцкім ранкам радыё разнесла страшную вестку—загінуў Юрый Гагарын. Загінуў чалавек, які ўвабраў у сябе лепшае, што ўласціва савецкаму чалавеку — бязмежную адданасць народа і партыі, ідэалам камунізма, храбрасць і мужнасць.

У адной з Маскоўскіх тэлеперадач, прысвечаных памяці загінуўшых герояў, адзін з паплечнікаў Юрыя Гагарына — лётчык-касманаўт Аляксей Ляонаў, паціраючы рукой стомлены асунуты твар, цяжка ўздыхнуўшы ціха вымавіў: «А наогул і не верыцца, што няма Юры...»

І ён нібы выказаў нашы пачуцці — сапраўды не верыцца... Не верыцца, што не пачуем яго маладога звонкага голасу, не ўбачым невысокай энергічнай постаці...

Але сапраўднасць няўмольная. Мільёны людзей ва ўсім свеце дзяжурылі ля тэлевізараў, што паказвалі жалобную Маскву. Мы бачылі, як бясконцым патокам ішлі і ішлі людзі да Цэнтральнага Дома Савецкай Арміі, дзе ў Чырванасцяжнай зале былі ўстаноўлены урны з прахам Юрыя Гагарына і Уладзіміра Сярогіна. Мы бачылі, як расла гара вянкоў, прынесеных, прысланых адусюль — з саюзных рэспублік, абласцей, раёнаў Масквы, прадпрыемстваў, навукова-даследчых устаноў, вянкі ад нашых зарубежных сяброў. Мы бачылі, як схіліўшы галовы, стаялі ў ганаровай варце, аддаючы апошні доўг Героям кіраўнікі Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, лётчыкі-касманаўты, славутыя ваеначальнікі, прадстаўнікі працоўных сталіцы...

І вось надышоў апошні дзень развітання — 30 сакавіка 1968 года. Пад гукі жалобных мелодый урны з прахам Юрыя Гагарына і Уладзіміра Сярогіна выносяцца з Цэнтральнага Дома Савецкай Арміі. Жалобная працэсія накіроўваецца на Красную плошчу.

Ля Дома саюзаў жалобную працэсію сустракаюць кіраўнікі Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада. Яны пераносяць урны на гарматны лафет. Працэсія накіроўваецца на Красную плошчу.

Ушанаваць памяць герояў, верных сыноў Камуністычнай партыі і народа тут сабраліся тысячы людзей. Іх позіркі накіраваны туды, дзе перад Маўзалеем У. І. Леніна высіцца гара з жывых кветак, якімі ўбраны урны з прахам загінуўшых.

На Цэнтральнай трыбуне Маўзалея члены і кандыдаты ў члены Палітбюро ЦК КПСС, сакратары Цэнтральнага Камітэта партыі, намеснікі Старшыні Савета Міністраў СССР, члены ўрадавай камісіі па арганізацыі пахавання, лётчыкі-касманаўты.

Жалобны мітынг адкрыў член Палітбюро ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС А. П. Кірыленка, які ў сваім слове, аддаў даніну пашаны і любві першаму ў свеце лётчыку-касманаўту Герою Савецкага Саюза Юрыю Гагарыну, а таксама Герою Савецкага Саюза, інжынер-палкоўніку Уладзіміру Сярогіну.

— Па зорнай трасе, пракладзенай Юрыем Аляксеевічам Гагарыным, — гаворыць ён, — паляцяць новыя караблі. З цягам часу чалавек дасягне іншых планет. Але як бы далёка ні пралягалі касмічныя шляхі, якія б новыя бліскучыя поспехі ні былі дасягнуты ў асваенні космасу, Юрый Гагарын будзе служыць выдатным натхняючым прыкладам для цяперашніх і будучых пакаленняў касманаўтаў...

Выступаюць прэзідэнт Акадэміі навук СССР М. У. Келдыш, слесар завода імя Уладзіміра Ільіча, Герой Сацыялістычнай Працы С. А. Антонаў, кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар МГК КПСС В. В. Грышын, ваенны лётчык, падпалкоўнік В. А. Абрамычаў, лётчык-касманаўт СССР, Герой Савецкага Саюза палкоўнік А. Р. Нікалаеў. Яны гавораць аб бязмерным смутку, які ахапіў увесь савецкі народ, з выпадку гібелі герояў, аб тым, што светлы жыццёвы шлях камуністаў Юрыя Гагарына і Уладзіміра Сярогіна будзе для кожнага савецкага чалавека натхняючым прыкладам беззапаветнага служэння сацыялістычнай Радзіме, справе Камуністычнай партыі.

Жалобны мітынг заканчваецца. Кіраўнікі Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, лётчыкі-касманаўты, прадстаўнікі Ваенна-Паветраных Сіл падымаюць урны і накіроўваюцца да Крамлёўскай сцяны.

Урны з прахам Ю. А. Гагарына і У. С. Сярогіна ўстанаўліваюць у нішах Крамлёўскай сцяны. У гэты суровы і трагічны момант сціхлася ўся краіна, ушаноўваючы маўчаннем памяць герояў.

Грыміць артылерыйскі салют, гучыць Гімн Савецкага Саюза.

Перад Маўзалеем урачыстым маршам прайшлі воінскія часці. Яны аддалі апошнія ўшанаванні Юрыю Аляксеевічу Гагарыну і Уладзіміру Сяргеевічу Сярогіну.

ПІСЬМЕННІК, ТРЫБУН, ГУМАНІСТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нават бегла гартаючы неабсяжную спісталярную спадчыну пісьменніка, і асабліва дваццаць шосты том яго твораў, можна зразумець — як шчодра раздорваў ён сябе не толькі ў маладыя гады, але і па канчатковым вяртанні на Радзіму з-за граніцы. Будучым гісторыкам давядзецца вытлумачыць, чаму і як ніводзін грамадска-важкі факт рэчаіснасці не заставаўся па-за яго ўвагай, без яго ацэнкі, водгуку, неадкладнага ўступлення ў бойку, зразумела—у логіцы таго дзесяцігоддзя. На тое самае, на што па летуценнай чэхаўскай прыкідцы адводзілася добрых трыста гадоў, Горкі імкнуўся здзейсніць калі не заўтра, дык хаця б на сваім веку, і ўсю сваю незвычайную творчую волю ўкладваў у спробу ўсямерна наблізіць будучае... Словам, узнікшы, нібы выбух, у застойнай цішы канца дзевятнаццатага стагоддзя, ён немалую частку сябе аддаў у выпраменьванне, і не дзіва, што так многае на пранягу адведзенага яму паўвеку наскрозь прасякнута, змацавана, афарбавана прывабнасцю яго ўсеабдымнай асобы.

Але калі б сам Горкі, гаворыць Л. Ляонаў, здолеў насуперак сцярджэнням перадавых навук, заглянуць **адтуль** на наш сённяшні вечар, мы б знайшлі довады абвергнуць яго апасенні, што недастаткова скапцэтраваў сябе на галоўным, што складае сапраўднае прызначэнне мастака. Мы сказалі б яму, што шкадаванне генія аб няздзейсненым прама прапарцыянальна памерам створанага ім,—што такія звоны,я для сваёй эпохі першыя яго апавяданні вядуць сваю работу далей, таму што нашчадкі, як раказіну прыклаўшы да вуха, могуць учуць у іх нарастанне гулу рэвалюцыйнай буры; што класічная па форме і бляску збагульнення яго трылогія, якая так цэльна ўпісалася ў самасвядомасць тагачаснай Расіі і, нібы люстра, змясціла ў сабе ўсю яе кіпучую, ужо ў браджэнні, нізавую рэчаіснасць, падводзіць чытача да вытокаў Кастрычніка, які пазней вызначыў будучае яго краіны. Мы паўтарылі б сказанае яму аднойчы сам-насам, што запеўная фраза **«дзяцінства»** па вобразнай структуры малюнка варта таго, каб стаць манфестам рэалістычнай школы вышэйшай дакладнасці, а створаныя ім партрэты славутых сучаснікаў надоўга застануцца ўзорамі славеснай гравюры. Мы ўголас падчулі б выпікі ўсяму напісанаму пра яго поўнай захаплення крытыкай—аб глыбіні яго афарыстычнага мыслення і шырокавугольнай зоркасці, якая здольна згусціць уражанне ў гранічнай трапнасці эпітэт, у інтанацыю, у бязважную паўзу, нарэшце, але ў першую чаргу—аб вынаходлівай тонкасці апісанняў і характарыстык, а таксама аб крынічнай свежасці горкаўскай мовы, якая пры ўсёй ёмістасці сваёй зачароўвала не толькі адукаваныя вярхі Расіі, але масу народную, для якой у асноўным ён і імкнуўся пісаць. Апрача поўных захаплення прызнаняў з боку равеснікаў і братоў па пяру, што часта толькі таму і не растварыліся ў забыцці, бо паспелі замацаваць у каментарыях да Горкага, мы нагадалі б напоўненыя павагай водгукі сучасных яму заходніх карыфеяў—ад Ралана і Уэлса да Гамсуна і Цвейга...

Яно надта блізкае нам і жывое да сёння, велізарнае і ўмяшчальнае, каб у кароткім нарысе разгледзець такую ёмістую, з прыбудовамі, гарышчамі, і анфіладамі ва ўсе бакі, горкаўскую асобу; пад канец , жыцця яго так і называлі ласкава і жартаўліва — **установай.** Пры такой яго ёмістасці самы выбар месца для агляду горкаўскай біяграфіі напазбежна робіцца партрэтам, нават пашпартам самага нарысіста. Усё паасобку важна ў ёй, але калі б мне давялося прасачыць яе паэтапна, то я спыніўся б не на якім-небудзь з перыядаў яго ўзыходжання, росквіту і сталасці—з непазбежнымі для такога чалавека роздумамі і ваганнямі, якія складаюць, так сказаць тэхнічны **люфт** інтэлектуальнай з'явы, а па прыёму, што зацвердзіўся ў маёй мастакоўскай практыцы, я аддаў бы найбольш часу разгляду первічнага, толькі што кінутага ў баразну жыцця зерня, з якога пазней узнікла гэта дзівосная, на рубяжы двух стагоддзяў чалавечая ўспышка.

І ў самым зародку зерня я змясціў бы сустрэчу маладзенькага кухарчука Алёшы Пешкава са спіплым кніжным куфэркам, дзе захоўваліся старадрукаваныя скарбы унтэра Смурага. Для падлетка гэта было ўсё роўна, што ў дрымучым лесе знайсці звязку чарадзейскіх ключоў да непадазраваемых нават дзвярэй велізарнага свету, што раптам расступіўся перад ім. Без памаганняў можна ўявіць сабе разгубленае спачатку прасвятленне хлапчука і гаму далейшых яго, чыста калумбавых здзіўленняў, якія толькі таму так горка недаступныя ўсім нам, большасці, што ў надта раннім узросце школьнага пазнавання мы пазбаўлены бываем, можа быць, найбольш трапяткой радасці жыцця—яшчэ раз зведаць захапленне прапанаваных нам адкрыццяў. Уяўляецца, што пасля самага павярхоўнага, на вокладках пакуль што, асвоєння знаходкі Алёшаў зачараваны стан змяніўся затым нясмелай гордасцю за сваю — і за сваю таксама!—прыналежнасць да такога магутнага, самаадданага, і пры ўсіх сваіх багаццях, такога незаслужана пакутнага роду чалавечага. А ў сваю чаргу, з поўнай маўклівай пашаны нематы першага азнаямлення са скарбам і павінна было нарадзіцца тое адчуванне, што ўсё жыццё не здраджвала Горкаму—адчуванне сябе струменьчыкам у вадаспадзе, правільней — велізарным **чалавекаспадзе,** што звяргаецца на адзіную турбіну прагрэсу... Горкі быў магутны ўсведамленнем сваёй **множнасці,** і вось чаму такімі злачынна-кашчунымі здаваліся яму ўсякая нотка лірычнага ныцця і скаргі на сваю нібыта адзіноту ў свеце. Менавіта нецярпеннем як мага хутчэй наблізіць, сустрэць, пры жыцці дакранунца рукою да пераўтворанай заўтрашняй цаліны і адзначай кожны радок Горкага,—на паталенне гэтай прагі ён і затраціў сваё гіганцкае дараванне.

Невядомы, яшчэ нічыёй пабочнай выкрывальнай падказкай не крануты свет тоіўся ў сундуку пад ложкам кухара Смурага. І якія прывіды хлынулі на Алёшу з-над вечка, абклееннага экзатычнымі карцінкамі,—у дыяпазоне ад казачна неадольных волатаў рускай лубковай класікі да змрочных, так сказаць, уласнага назірання дэманскіх зданяў алхіміка і містыка Экартсгаўзена!.. Дарэчы: здавалася б, якая небяспечная і падманлівая пастка для неспрактыкаванага падлетка, які да таго ж уступае, як кажуць, на шлях барацьбіта ды яшчэ пралетарскага пісьменніка, але дзеля спраўджання старадаўняга выслоўя аб уменні мудрых здабываць карысць нават з кепскіх крыніц, якраз праз гэты патаемны ход можна было пранікнуць у таямнічае падзямелле рускага франк-масонства і, значыць, даведацца сёе-тое пра фанатычную, дагэтуль цікавую ордэнскую арганізацыю XVIII стагоддзя, якая толькі дзеля незасмечвання галоў хавалася ад абывацеля, а ў сапраўднасці была магутная і дамагалася, як гэта часта бывае, даволі празаічных зямных мэт пад выглядам стварэння нябеснай рэлігіі.

Прамоўца характарызуе выказваючую ролю як станоўчых, так і адмоўных вобразаў у літаратурных творах Затым дзеліцца сваім роздумам аб рускай літаратуры мінулага стагоддзя.

У заключэнне сваёй прамовы Л. М. Ляонаў сказаў:

— І яшчэ пастане калі-небудзь, ужо без нас, чарговага стагоддзя гэтакі ж самы вечар. Другія, хто яшчэ не ўвайшоў, яшчэ не нарадзіўся, запоўняць вашыя месцы ў гэтай зале, але якім бы каштоўным ні быў іх час, немагчыма ўявіць, калі-нікалі яны не ўспаміналі пра нас з вамі, якія затрашілі ў імя іх, заўтрашніх, столькі жыццяў, гарачага поту і натхнення. Азірнуўшыся на наш век з яго затухаючым зарывам вялікіх бітваў, эпахальных пажараў і бівачных вогнішчаў на шляху ў зямлю абетаваную, яны сярод іншых велічных ценяў, на фоне палымнеючага неба, разгледзяць і характэрную сутулаватую постаць Максіма Горкага... З-пад застрэшка прыціснутай да ілба далоні, з той жа непаўторнай, ледзь іранічнай і лагодна-добрай усмешкай, ён будзе пранікліва глядзець услед ім, пакаленням, якія ідуць усё ўперад і далей і ў якія ён так верыў—трыбун, паэт, бунтар, банька і наставўнік чалавекоў.

І вось ужо новыя выступленні, новыя ўсхваляваныя словы аб Буравесніку рэвалюцыі гучаць у Крамлёўскім Палацы з'ездаў.

Слова даецца **Леаніду Собалеву:**

— Чалавек, які ва ўмовах класавага, каставага, мяшчанскага і ўласніцкага грамадства, у надзвычай жорсткіх умовах самаўладства выбіўся з нізоў народа і дасягнуў прызнання ўсенароднага і сусветнага. Гіганткі, самабытны талент літаратара, незвычайная здольнасць пранікаць у душу і ў думкі людзей. І—адначасна—гэтакая ж незвычайная энергічная здольнасць да стваральных дзеянняў арганізатара.

Вось што такое Аляксей Максімавіч Горкі.

Ён пакінуў нам надзвычайнае літаратурнае багацце, стварыўшы на старонках кніг вечна жывыя вобразы сваіх сучаснікаў і філасофію іх—убогую, мяшчанскую або натхнёную, рэвалюцыйную.

І ён жа ў першыя гады рэвалюцыі заклаў шматлікія асновы будучай культурнай магутнасці маладой Савецкай дзяржавы: выдавецтва, дзе сабраў вечныя шэдэўры літаратуры, серыю твораў аб маладым чалавеку XIX стагоддзя, «Гісторыю заводаў і фабрык». Усё гэта было прагрэсіўным фундаментам будучага.

І ён жа быў натхнёнелем і стваральнікам нашага Саюза пісьменнікаў СССР.

І ён жа ўпершыню адкрыў свету тое, чым савецкая літаратура адрозніваецца ад усіх літаратур мінулага і сучаснасці: яе шматмоўнасць, яе інтэрнацыянальную магутнасць, яе разнастайнасць традыцый, форм і моў пры адзінстве галоўнай ідэі.

І ён жа, прадбачачы трагедыі, якія ўчыніць на старым нашым зямным шары бесчалавечная філасофія фашызму, задаў культурнай эліце планеты прамое і чэснае пытанне: «З кім вы, «майстры культуры»?»

Вось толькі некалькі граней алмаза, які веяна будзе зіхацець у стагоддзях. І мы ганарымся тым, што менавіта рускі народ і Савецкая ўлада ўзнялі над планетай гэты бясцэнны алмаз.

У тым велічным вобразе, які створаны ўсім цудоўным жыццём Аляксея Максімавіча Горкага, ёсць адна рыса, якая асабліва дарагая нам, сучасным пісьменнікам Расійскай Федэрацыі. Гэта—яго пільная, любоўная ўвага да ўсіх талентаў, што нараджаліся на прасторах нашай краіны, і (як ён сам гаварыў) да «іншаплямённых літаратур».

Калісці, — гаворыць далей прамоўца,—Аляксей Максімавіч пісаў:

«Капіталістычны свет выхаваў вучоных, якія дказваюць, што расавыя адрозненні людзей прымірыць нельга. Рускі рабочы клас, наша рабоча-сялянская ўлада і словам і справай даказваюць, што гэта не так. Мы жывём у эпоху цудаў, якія твораца розумам і воляю людзей. Фінскія і цюрка-фінскія плямёны, старажытнае насельніцтва Паволжа—мардва, чуваны, чарамісы—тысячагоддзі жылі, як нямыя, без граматы, без пісьменнасці, але вось яны за дзесяць гадоў ужо стварылі свае газеты, выдаюць кнігі на сваіх мовах... Вялізную работу зрабілі казанскія татары, у якіх ужо хутка расце мастацкая літаратура... Кіргізы, башкіры, калмыкі, плямёны Паўночнага Каўказа і Сярэдняй Азіі—усе разнародныя людзі Саюза Саветаў з неверагоднай хуткасцю дружна пачалі вялікую работу далучэння да сусветнай культуры праз развіццё сваёй племянной».

Гэтыя словы збыліся. Але толькі ў нас, у лагеры сацыялізма!

А на планеце—расавая рознасць усё яшчэ зневажае чалавечы гонар. На планеце па-ранейшаму існуюць дыскрымінаваныя нацыі і плямёны, праклятая адрыжка арыйскага фашызму—чыстыя і гразныя расы. Ідуць гвалтоўныя войны. Ваенныя заправілы Грэцыі заганяюць у турмы і рабочых, і сялян, і інтэлігенцыю, Ізраільскія агрэсары па-ранейшаму забіваюць арабаў.

Народы Савецкага Саюза і іншых сацыялістычных дзяржаў,—гаворыць у заключэнне Леанід Собалеў,—непарушна стаяць на варце міру і дружбы народаў, на варце свабоды і прагрэсу. Пра гэта марыў і ваяваў за гэта Аляксей Максімавіч Горкі—хай будзе назаўсёды святым яго імя для ўсіх, хто мае высокае права называць сябе людзьмі!

На трыбуне—**Мікола Бажан.**

— Непадзельна, неразрыўна, усімі фібрамі сваёй магутнай душы,—пачынае ён сваё выступленне,—вялікі пісьменнік паяднаўся са сваім вялікім народам. Такі няўтольна прагны да жыцця ва ўсёй яго разнастайнасці, ва ўсёй яго невычэрпнасці, Горкі асабліва ўражліва, глыбока, патрабавальна ўглядаўся ў жыццё роднай яму Расіі. Ён пісаў: «...Я бачу рускі народ выключна, фантастычна таленавітым, своеасаблівым...» і прадказваў, што «гэты цудоўны народ» будзе жыць казачна-гераічным жыццём і шмат чаму навучыць гэты і стомлены, і ашалелы ад злачынстваў свет. Не месіянствам, а разуменнем сапраўднай ролі рускага народа, рускага рабочага класа з яго рэвалюцыйнай, бальшавіцкай, ленінскай мэтанакіраванасцю ў будучыню народжаны гэтыя прарочыя словы.

Разуменнем, веданнем, верай, любоўю... Гэта тая ж любоў, якая нарадзіла натхнёнае ленінскае слова «аб нацыянальнай гордасці велікаросаў» і якая не можа не быць любоўю пралетарскага інтэрнацыяналіста, што аб'ядноўвае адданасць свайму народу з самаадданай рашучасцю служыць усім народам у іх імкненні да дабра, праўды і прыгажосці, да, камунізма.

Менавіта такі Горкі. Вялікі змагар за братэрства народаў, братэрства людзей, ён тым самым— і непрымірымы змагар супраць любых формаў нацыяналістычнай тупасці, шавіністычнай дзікасці.

Прыгнечаныя царызмам народы—рускі, украінскі, беларускі, грузінскі, яўрэйскі, латышскі і ўсе іншыя добра чулі голас роднага пісьменніка. Ён быў з імі ў іхняй барацьбе. Ён звяртаўся да іх свабодалюбівых сэрцаў, і яны з любоўю прынялі яго ў сваё бессмяротнае сэрца.

Для ўкраінцаў,— падкрэслівае прамоўца,— імя Горкага—роднае імя, яго слова—роднае слова. Горкі ад самага пачатку сваёй пісьменніцкай і грамадскай дзейнасці быў звязаны з Украінай, пісаў аб ёй, аб яе людзях, абараняў іх сацыяльныя і нацыянальныя правы, змагаўся за свабоду іх культуры, мовы, літаратуры.

Многія месяцы ў 1897 і 1900 гадах Горкі жыў, працаваў, вучыўся і вучыў народ у самым, можна сказаць, цэнтры Украіны—на Палтаўшчыне, у вёсцы Мануйлаўцы. Кожны год увесну ў Мануйлаўцы збіраецца народ на горкаўскія ўрачыстасці. З любасцю сабраны музей Горкага ў Мануйлаўцы адчыніў свае дзверы для наведвальнікаў.

Горкі сам прызнаваўся ў сваім пастаянным «влечэнні в роде недуга» да літаратуры Украіны, у «влечэнні» такім шчодрым, такім разнастайным. Ён схіляўся перад рэвалюцыйнай мастацкай сілай паэзіі Шаўчэнкі, клапаціўся аб тым, каб рускі народ атрымаў добры пераклад «Кабзара». З глыбокай павагай ставіўся Горкі да Івана Франка. Задоўга да рэвалюцыі ў часопісах, якімі кіраваў Горкі, друкаваліся і Кацюбінскі, і Леся Украінка, і Стэфанік, і Кабылянская. Сімвалам братняга яднання рускай і украінскай культур з'яўляецца дружба Горкага з Кацюбінскім.

Ад пачатку пісьменніцкага шляху і да апошніх сваіх дзён Горкі цікавіўся, чытаў, цаніў працы украінскіх пісьменнікаў. Ён іх ведаў, пачынаючы ад Скаварады і Катлярэўскага да вершаў Тычыны і аповесцей Юрыя Яноўскага. А колькі ўкраінскіх літаратараў, якія жывуць і сёння, сустракаліся з ім, і ён гаварыў ім рэчы, важнасць якіх і да гэтага часу не зблякла!

Горкі—не толькі наша гордасць і сіла, і апора. Горкі належыць усяму перадавому чалавецтву, але ён—перш за ўсё вялікі сын Расіі, ён—перш за ўсё сын нашай Радзімы, ён—перш за ўсё блізкі і дарагі нам, дочкам і сынам савецкіх народаў.

— Мы ганарымся тым, — гаворыць брыгадзір электразваршчыкаў Горкаўскага завода «Чырвонае Сормава» **Вячаслаў Пайшчыкаў,**—што наш горад даў свету найвялікшага пралетарскага пісьменніка. На нашай ніжагародскай зямлі Алёша Пешкаў зрабіў першыя ў жыцці крокі, правёў суровае дзяцінства, перанёс знявагі, працуючы «ў людзях».

Пасля доўгіх вандровак па Русі ён вярнуўся ў родны горад, тут падужэў яго пісьменніцкі талент. Тут былі напісаны многія апавяданні, раманы «Фама Гардзееў», «Трое», п'еса «На дне». Тут была створана «Песня пра Буравесніка», якая прароча прадказала блізкасць рэвалюцыйнай буры.

Мне, сормавічу, асабліва радасна, што Аляксей Максімавіч быў цесна звязаны з рабочымі нашага завода, што іх рэвалюцыйная барацьба адлюстравана ў бессмяротным рамане «Маці».

У гэтым рамане ў апісанні рабочай слабодкі і фабрыкі паказана аблічча старога Сормава. Усім псмніцца панурая карчма беднага рабочага пасёлка. Маленькія шэрыя дамы. Брудныя вуліцы, па якіх брыдуць на работу панурыя людзі. Вечарам, змучаныя, яны вяртаюцца дадому, «бліскаючы галоднымі зубамі».

Але нават у гэтым змрочным жыцці Аляксей Максімавіч здолеў разгледзець іскры новага, новых людзей — смелых, непахісных, як Павел Уласаў. Упэўнена выйшлі яны на шлях рэвалюцыйнай барацьбы, азораныя святлом ленінскіх ідэй. За імі пайшлі мільёны.

Выступаючы на мітынгу сормавічаў летам 1928 года, Горкі з захапленнем гаварыў пра веліч нашых працоўных дасягненняў. Ён гаварыў аб мудрасці нашай партыі, называючы яе нашым мозгам, нашай сілай, нашым адзіным сапраўдным правадыром.

Калі ў 1928 годзе Горкі прыехаў да нас у Сормава, яшчэ тольки будаваліся магутныя індустрыяльныя гіганты. Сормава яшчэ не зведала карэннай рэканструкцыі.

У нашы дні родны горад Аляксея Максімавіча стаў адным з буйнейшых прамысловых і культурных цэнтраў Савецкага Саюза.

Мы, сормавічы, ганарымся рэвалюцыйным мінулым нашага завода, ганарымся яго працоўнай славай, памнажаем яе.

Землякі Горкага беражліва ахоўваюць памятныя мясціны, звязаныя з імем вялікага пісьменніка. З гонарам носяць яго імя сам горад і многія прамысловыя прадпрыемствы, установы культуры.

Ад імя гаркаўчан, ад імя слаўнага атрада рускага рабочага класа — сормавічаў, усклікае прамоўца, выказваю ўпэўненасць, што мы і надалей будзем вернымі запаветам Горкага — ісці «ўперад! — і вышэй! Усё ўперад і — вышэй!»

— Сто гадоў назад, — гаворыць старшыня Саюза пісьменнікаў Балгарыі **Георгій Джагараў,** — у гэты дзень нарадзіўся чалавек, які ўвасобіў у сабе ўсё багацце чалавечай прыроды, усе яе бясконцыя магчымасці барацьбы і творчасці. І таму мне хочацца па старажытнаму балгарскаму звычаю пацалаваць руку той маці, — вялікай рускай зямлі, якая яго нарадзіла і ўзгадавала.

На жаль, у мяне няма асабістых успамінаў аб Горкім. Хаця, калі ўжо гаварыць аб успамінах, то кожны балгарын мог бы расказаць, як ва ўмовах капіталізму кнігі Горкага вялі нас з цемры да святла, як яны вучылі, запальвалі нашы сэрцы і душы, абуджалі нашу свядомасць, клікалі да рэвалюцыйных дзеянняў, фарміруючы ў нас камуністаў, барацьбітоў за справу рабочага класа.

Балгарыя палюбіла Горкага з першых жа яго твораў. Мы ганарымся тым, што побач з нашым класікам Іванам Вазавым ён — самы папулярны пісьменнік у нашай краіне.

Балгарыя палюбіла Горкага. І Горкі палюбіў Балгарыю з яе гісторыяй, пакутамі і спадзяваннямі. Ён горача адгукаўся на кожную падзею, якая датычылася нашага народа, верыў у наш народ, у яго будучыню. Ён сябраваў з балгарскімі рэвалюцыянерамі, дапамагаў балгарскім пісьменнікам, накіроўваў іх творчасць па правільнаму шляху, захапляючы іх ідэямі пралетарскага гуманізму. Незабыўнай старонкай у гісторыі нашых народаў застанецца дружба вялікага пісьменніка з Георгіем Дзімітравым.

Велізарны ўплыў Горкага, надзвычайную сілу яго ўздзеяння на мільёны людзей нельга вытлумачыць толькі пісьменніцкім талентам. Горкі першы ў сусветнай літаратуры паяднаў справу пісьменніка са справай рабочага класа, ён першы выказаўся за партыйнасць мастацкай творчасці, першы абвясціў новую эпоху ў літаратуры — эпоху сацыялістычнага рэалізму.

Ва ўсіх адносінах творчасць Горкага — прыклад для нас, пісьменнікаў усяго свету. Ад Горкага адмаўляюцца толькі мяшчане, рэакцыянеры, цемрашалы, ворагі роду чалавечага. З Горкім і за Горкім ідуць усе, хто любіць духоўнае здароўе чалавецтва, хто хоча пазбавіць свет ад улады «жоўтага д'ябла», ад войнаў і галечы, хто паўстае супраць заняпаду сучаснай культуры, хто лічыць сябе сумленнымі і годнымі людзьмі.

Выступае **Мікалай Ціханаў:**

— Як вялікі гуманіст Аляксей Максімавіч вучыў нас прыродзе новага гуманізму: «Гуманізм пралетарыята патрабуе непагаснай нянавісці да мяшчанства, да ўлады капіталістаў, іхніх лёкаяў, паразітаў, фашыстаў, катаў і здраднікаў рабочага класа, нянавісці да ўсяго, што прымушае пакутаваць, да ўсіх, хто жыве па пакутах соцень мільёнаў людзей».

І сёння, калі Савецкі Саюз аб'ядноўвае ўсе прагрэсіўныя сілы чалавецтва, усіх сумленных людзей зямлі ў барацьбе за мір і дэмакратыю, супраць шалёных імперыялістаў, палымяе слова Максіма Горкага зноў магутна гучыць, абрушваючыся на новых прэтэндэнтаў на сусветнае панаванне!

Выконваючы запавет Горкага, савецкія людзі нястомна выступаюць пад сцягам таго гуманізму, які ён высока ўзняў у свой час і сцвярджальна пранёс праз усё жыццё.

І сёння, калі імперыялісты вядуць крывавую захопніцкую вайну ў В'етнаме, калі рэакцыянеры — саюзнікі фашызму, што зноў адраджаецца, усюды нарошчваюць інтрыгі і змовы, узбройваюцца ідэямі дзікага нацыяналізму і расізму, ідэямі, што даўно аджылі, выхоўваючы ў сваіх паслядоўніках садыстскую прагу да забойства і разбурэння, савецкія абаронцы міру і ўсе людзі добрай волі вядуць барацьбу супраць іх, памятаючы мудрыя заклікі Горкага, вялікага барацьбіта за будучыню чалавецтва, абаронца сапраўднай культуры, непрымірымага змагара з фашызмам.

Аляксей Максімавіч быў сапраўды вялікім ініцыятарам. Ён выклікаў да жыцця часопісы для пісьменнікаў-пачаткоўцаў, для калгаснікаў, па яго ініцыятыве ўзніклі «Гісторыя грамадзянскай вайны», «Гісторыя фабрык і заводаў», часопісы «За рубежом», «Наши достижения» і іншыя.

Клапоцячыся аб будучых паэтах, ён стварыў выдатнае выданне «Библиотека поэта». Гэта горкаўскае пачынанне бліскуча апраўдала сябе. Кнігі вялікай і малой серыі атрымалі шырокае распаўсюджанне і самае шырокае прызнанне. І сярод іх заслужанае месца заняла кніга вершаў самога Аляксея Максімавіча.

Горкі быў вялікі жыццялюб, бунтар, мудрэц, пісьменнік і паэт, які прагрымеў у самыя цёмныя часы песняй пра Сокала, бліснуў крылом свайго Буравесніка над хваляй узбуджанага народнага мора.

Максім Горкі сам быў Буравеснікам слаўнай будучыні чалавецтва, паэтам наступных рэвалюцыйных бур, паэтам, які апеў прыход у свет новага Чалавека з вялікай літары, будаўніка сацыялістычнага свету.

І любімаму нашаму, слаўнаму Буравесніку — дарагому Аляксею Максімавічу, Максіму Горкаму аддаём мы сёння вялікую ўсенародную пашану і хвалу!

Творчаму вопыту Горкага, традыцыям Горкага, як асноўным прынцыпам савецкай літаратуры і мастацтва, прысвячае сваё выступленне **Чынгіз Айтматаў.**

— Як вядома, — адзначае ён, — традыцыі ніхто не ўстанаўляе па сваіх меркаваннях. Яны вынікаюць з аб'ектыўнага вопыту мастака, яны бяруцца на ўзбраенне не па загаду ці просьбе, а ў сілу жыццёвай патрэбы ў іх. Не раз і не два гадасы з Захаду спрабавалі нас зняверыць у правільнасці і жыццездольнасці горкаўскіх традыцый. Што, маўляў, горкаўская пара ў літаратуры прайшла, што вопыт яго ўжо вычарпаны, што на сучасным этапе літаратура і мастацтва развіваюцца больш складанымі, больш супярэчлівымі шляхамі і г. д. і да т. п.

З таго часу, як Горкі пайшоў ад нас, прайшло нямала гадоў. Свет перажыў за гэтыя гады шмат нечуваных бедстваў. Гітлер з яго цемрашальствам, з яго чалавеканенавісніцкімі тэорыямі, з яго знішчэннем усяго іншадумнага, усяго лепшага ў культуры, другая сусветная вайна — разгром фашызму, што каштаваў акіяна крыві, болю і пакут народаў, пасляваеннае ажаўрэзенне і новы прыступ халоднай вайны, і новыя ўспышкі імперыялістычных войнаў на планеце. І новыя зверствы людзей над людзьмі і ў гэту мінуту, і ў гэту секунду на шматпакутнай зямлі В'етнама!

І ў гэтым супрацьборстве светаў, у гэтым кіпенні гісторыі, пасярод хаосу і разброду ў адной часткі заходняй інтэлігенцыі, сярод расчаравання і разгубленасці другой яе часткі, сярод адкрытых заклікаў да «дэгерэзацыі», да «дэідэалагізавання» мастацтва, сярод нявер'я ў розум чалавека і сцвярджэння яго «некамунікабельнасці» з да сябе падобнымі і навакольным светам рэчаў, сярод нябачных і адкрытых намаганняў вызваліць чалавека ад пачуцця адказнасці, зрабіўшы немагчымым усведамленне ім свайго чалавечага і грамадзянскага абавязку, сярод раз'юшанай пропаведзі гвалту, і нізкіх інстынктаў, універсальнай мадэлі славутага «звышчалавека» — сярод усяго гэтага, сярод аглушальнага бума «масавай», «камерцыйнай», «індустрыяльнай» і ўсяляких іншых падробак «суперкультур» закліканых устараняць драматызм супярэчнасцей, супакойваць і абалваньваць абывацеля, сярод усёй гэтай сутаргавай мітусні зноў і зноў чуецца з нашага берагу несціханы голас Горкага: «З кім вы, «майстры культуры»?»

Гэта першы запавет яго традыцый. Бо за гэтымі словамі стаіць адвечнае пытанне: дзеля чаго пісаць, што пісаць, як пісаць? Голас Горкага — голас савецкай літаратуры. І мы ідзём за Горкім, бо бачым у ім крытэрый сумлення мастака, бачым у ім найвышэйшы прыклад ваяўнічага гуманізму, чалавечнасці і прыгажосці духу.

Што ж датычыцца новых прынцыпаў адлюстравання рэчаіснасці, эстэтычных канцэпцый, якія вынікаюць з вопыту Горкага, то і тут перад намі першы па значэнню майстар сусветнага рэалізму. Пісьменнік бескампраміснай, сацыяльнай яснасці, пісьменнік сапраўды народнай і сапраўды высокай культуры, культуры выключнай, велізарнай, якая ўвабрала ў сябе ўсё лепшае, што было выпрацавана дагэтуль, і таму яна так магутна, так уладарна, так пераканаўча ўздзейнічае на нас. Рэалізм Горкага застаецца крытэрыем сучаснага рэалістычнага пісьма. Мы стаім на традыцыях Горкага, бо гэтыя традыцыі ўваходзяць у нашу ўнутраную творчую патрэбнасць, бо гэтыя традыцыі дапамагаюць нам найбольш аб'ектыўна пазнаваць і адлюстроўваць нашу рэчаіснасць, спрыяюць выкананню задач літаратуры ў пабудове камуністычнага грамадства.

Узнікненне сучасных прафесіянальных літаратур у Сярэдняй Азіі і ў Казахстане, адзначае далей Чынгіз Айтматаў, было актам небывалага культурнага і сацыяльнага прагрэсу. І гэта было шчасцем для нас, што нашы першыя пісьменнікі, якім прадстаяла яшчэ ўсвядоміць перамены ў лёсе народаў, не толькі палітычна, але і па-мастацку, з першых крокаў свайго пачатковага шляху сустрэлі Горкага.

У гэтым заключаўся факт сапраўды сімвалічнага значэння. Калі рускі пралетарыят, калі Ленін і партыя ўзнялі нашы народы на сацыяльную барацьбу, на ўдзел ва ўстанаўленні савецкага ладу, то рускі пісьменнік Горкі стаў духоўнай школай савецкіх нацыянальных літаратур.

Горкі, заключае прамоўца, быў бацькам дружбы культур савецкіх народаў. Ён — сцяг нашага інтэрнацыянальнага братэрства, ідэйнай еднасці ўсіх дзеячоў савецкай культуры.

— Амаль ва ўсіх тэатрах нашай краіны і за мяжой, — сказала народная артыстка СССР **Ала Канстанцінаўна Тарасава,** — ідуць п'есы Горкага. Як хацелася б, каб у тэатрах нашай краіны не сыходзілі са сцэны гэтыя п'есы! Іх павінны ведаць і бачыць усе пакаленні, што ідуць на змену адно аднаму. Мы павінны берагчы нашу класіку і правільна яе перадаваць. Нам, акцёрам, вельмі хораша гаварыў Станіслаўскі: Вы можаце іграць горш або лепш, але заўсёды павінны іграць праўдзіва.

Мне здаецца, што мы можам гэтае слова дастасаваць і да пастаноўкі нашай класікі, у першую чаргу Горкага. Такі аўтар, як Горкі, заўсёды ведаў, што ён хоча сказаць сваёй п'есай. Трэба правільна прачытаць п'есу, і тады адбудзецца выдатнае зліццё аўтара, акцёра і рэжысёра.

Імя Аляксея Максімавіча Горкага назаўсёды звязана з Маскоўскім Мастацкім тэатрам На сцэне Мастацкага тэатра нараджаліся п'есы Горкага. Аляксею Максімавічу быў дарагі Мастацкі тэатр.

У 1902 годзе 26 сакавіка адбылася прэм'ера «Мяшчан». У тыя гады Станіслаўскі гаварыў: «Браджэнне і рэвалюцыя, якая нараджаецца, прынесла на сцэну рад п'ес, што адлюстравалі грамадска-палітычны настрой, незадаволенасць, пратэст, мару аб герої, які гаворыць праўду». Гэтыя словы звязаныя з пастаноўкай «Мяшчан».

Настроі маладога Мастацкага тэатра пераклікаліся з ідэямі Горкага. В. І. Качалаў у сваіх запісках пісаў: «Бунтарства і пратэст, з якім малады, але ўжо вядомы пісьменнік падыходзіў да асноў тагачаснай рэчаіснасці, былі блізкія бунтарству і пратэсту нашага маладога тэатра».

Легендарную гісторыю мае спектакль «На дне». П'еса «На дне» была пастаўлена ў 1902 годзе 18 снежня. Поспех яе быў велізарны. Як гаварыў аб прэм'еры сам Горкі, ён не чакаў такога поспеху. Гэта было сапраўды поўнае зліццё аўтара, акцёра і рэжысёра. Вобразы Горкага, створаныя ў гэтай п'есе нашымі, як мы іх з любасцю называлі, «славутымі старымі», незабыўныя. Хто можа забыць Саціна — Станіслаўскага, Луку — Масквіна, Барона — Качалава, Насцю — Кніпер-Чэхаву, Васілісу — Шаўчэнка, Бубнова — Лужскага, Татарына — Вішнеўскага!

Спектакль гэты жыве і па сённяшні дзень. Цяпер яго выконвае ўжо трэцяе пакаленне акцёраў. У гэтай п'есы доўгае выдатнае жыццё. Яна сыграна больш за 1500 разоў, ідзе на сцэне Маскоўскага Мастацкага тэатра 65 гадоў. У гісторыі тэатра такога амаль не сустракалася.

На сцэне Мастацкага тэатра цяпер ідуць п'есы Горкага «На дне», «Мяшчане», «Ягор Булычоў і іншыя» і да стагоддзя Горкага адноўлены «Ворагі». Гэтыя п'есы вечна будуць жыць на нашых сцэнах, і гэта будзе лепшым помнікам вялікаму Горкаму!

Слова — **Кайсыну Куліеву:**

На гэту сусветную ўрачыстасць вялікага мастака працоўных, геніяльнага паэта чалавецтва, на ўсенароднае ўшанаванне першага савецкага пісьменніка — Максіма Горкага я прыйшоў, каб пакланіцца яго светламу імені, яго памяці ад усіх народаў Каўказа, якім ён дарагі гэтак сама, як і рускім рабочым, сялянам, інтэлігенцыі. Для мяне, сына горскага пастуха з Чагемскай цясніны, вялікі гонар і радасць сказаць тут пра любоў каўказскіх народаў да Максіма Горкага — выхадца з гушчы народных мас Расіі, які здолеў стаць вялікім пісьменнікам, сусветным мастаком слова. Мне гэта прыемна ўдвая, таму што мой дзед і мой бацька не ведалі нават граматы і ніколі не трымалі ў руках кнігі.

Мне, гаворыць далей прамоўца, радасна сказаць тут і пра тое, што Горкі любіў і разумеў Каўказ. На Каўказе, які так многа азначаў для вялікіх рускіх паэтаў, было надрукавана першае апавяданне Горкага. Блаславёныя землі і неба, горы і людзі краіны, дзе за небывалы подзвіг багі прыкавалі да скалы тытана Праметэя, былі дарагія Горкаму — Праметэю новай культуры чалавецтва. Ён да канца жыцця сачыў за ростам літаратуры каўказскіх народаў, радаваўся поспехам нашых пісьменнікаў, адзначаў іх у сваіх артыкулах і гутарках. Я гавару пра гэта для таго, каб падкрэсліць несакрушальнае пачуццё інтэрнацыяналізму і брацтва культур народаў, якім так дарожылі геніяльны рускі пісьменнік. Пра гэта ніколі не павінны забываць мы савецкія літаратары. Гэта наш святы абавязак перад памяццю бессмяротнага настаўніка.

Свет ведаў нямала вялікіх раманістаў і апавядальнікаў і да Максіма Горкага. Але Горкі заняў асобае месца ў пантэоне самых выдатных майстроў як першы вялікі мастак працоўных. Ён сказаў новае слова ў сусветнай літаратуры, у якую з ім прыйшлі зусім новыя героі. Ён упершыню так магутна і на поўны рост паказаў пралетарыяў, стаў песняром рэвалюцыі, барацьбітом.

Адным з галоўных запаветаў Максіма Горкага мне ўяўляецца абарона чалавека, які працуе і

Малюнкі мастака В. Шаранговіча да кнігі «Мая Беларусь» Т. Хадкевіча, якая выходзіць у выдавецтве «Беларусь».

Свет кніг

СУВЯЗІ ДАЎНІЯ, НЕПАРЫЎНЫЯ

У гэту кнігу ўвайшлі артыкулы і ўспаміны дваццаці аўтараў, і ўсе яны гавораць пра адно: пра тое, што беларуская літаратура — дарэвалюцыйная і савецкая — развівалася пад жыватворным уплывам Максіма Горкага, яго творчасці, яго эстатычных поглядаў і запаветаў.

У самым пачатку кнігі чытаем поўныя хвалявання словы Янкі Купалы, сказаныя ім у снежні 1934 года: «...у сваім сэрцы я на працягу многіх год хаваю чысцейшую і бязмежную любоў да вялікага рускага народа і яго геніяльнага пісьменніка Аляксея Максімавіча Горкага, які ў... змрочныя часы заўважыў маю песню. Глыбока ўзрушыў мяне тады цёплы водгук Аляксея Максімавіча і яго пераклад верша «А хто там ідзе?»

Другам і настаўнікам называе Горкага Якуб Колас: «Помню радасць, з якою я прачытаў словы Аляксея Максімавіча: «У Беларусі ёсць два паэты...»

Добра знаёмыя, амаль усімі завучаныя напамяць словы Горкага з яго пісьма Кацюбінскаму пачынаюць гучаць па-новаму, калі іх прыводзяць у сваіх успамінах тыя самыя **два паэты** — Купала і Колас. І яшчэ лепш пачынаеш разумець, як многа значылі гэтыя словы, якую непараўнальную сілу падтрымкі і стымулу мусілі яны мець для двух, яшчэ невядомых Расіі і свету маладых беларускіх паэтаў!

Але не толькі сяброўскім словам, не толькі сваімі творамі падтрымліваў і бадзёрыў Горкі беларускага пісьменніка-дэмакрата, сына і гадаванца народных «нізоў» — агромністае значэнне мела і само горкаўскае жыццё, яго біяграфія, і пра гэта вельмі хораша сказаў Змітрок Бядуля: «Яно (імя Горкага) узвышала мяне, узбройвала надзеяй, што пры настойлівасці і энергіі можна выйсці ў людзі і з «нізоў», з беднаты, як выйшаў у людзі ён, Аляксей Максімавіч».

З цікавасцю чытаюцца ўспаміны М. Лынькова, П. Галавача, А. Александровіча пра іх сустрэчы з Горкім — спачатку ў 1928 і 1931 гг., у Негарэлым і Мінску, калі Горкі вяртаўся з Італіі на радзіму, і пазней, у часе І з'езда пісьменнікаў СССР.

Жыва і непасрэдна напісаны ўспаміны Р. Кобеца — расказ пра тое, як яму, качагару піваварнага завода «Беларусь» (індустрыя тагачаснага Мінска!) выпаў высокі гонар вітаць Горкага ў Негарэлым і як яго збіралі рабочыя («не так гальштук завязаны... На грабёнку»), і як дырэктар выдаў яму пралётку (тагачасны транспарт!), каб не спазніўся, і пра многае іншае, што праз многія гады даносіць жывыя прыкметы абставін, часу, адносін рабочых Мінска да свайго, да роднага Максіма Горкага.

Не горш расказана і пра другую сустрэчу Кобеца з Горкім — у Маскве... «У Негарэлым ты растрывожыў мяне, — гаварыў тады Майстар качагару-пачаткоўцу. — Вымусіў прасляціца старога, а адной фразай, адным словам разануў слых. Памятаеш? Ты сказаў: «Мы цяпер сталі культурнёй». З націскам на апошнім складзе. А трэба было сказаць «культу́рней». Зразумела?..»

А пра што пішуць маладзейшыя, тыя, хто не бачылі жывога Горкага?.. Янка Брыль — і ва ўласцівай яму лірычна-споведальнай манеры — пра тое месца, якое заняў Горкі ў пошуках цэласнага і жыццеўстойлівага маральнага светапогляду. Іван Навуменка — пра Горкага, які выхоўваў высокія рамантычныя адносіны да жыцця, пра тое, як савецкі салдат шукаў і знаходзіў у 1945 годзе ў Германіі ўцалелыя горкаўскія кнігі. А Васіль Быкаў... Пра што ж яшчэ пісаць Быкаву, як не пра вайну, пра плацдарм за Сератам, пра закіданыя кукурузай гарматы — і пра тое, як там, у кароткія перапынкі паміж баямі, наводчык Болькін (хутка яго зрэжа кулямётная чарга) чытаў уголас старую, «з рудымі плямамі, абдзёртую» кнігу — «Мае універсітэты»...

Не будзем пералічаць усяго змешчанага ў зборніку «Горкі і Беларусь». Адзначым толькі, што, акрамя пісьменніцкіх успамінаў, тут можна прачытаць і асобныя змястоўныя артыкулы. Скажам, артыкул І. Баса, дзе, здаецца, упершыню сістэматызаваныя водгукі друку дарэвалюцыйнай Беларусі на творчасць Горкага, на спектаклі па яго п'есах.

Шкада, што некаторыя артыкулы паўтараюцца і што дзе-нідзе ў іх сустракаюцца непрадуманыя палажэнні, фактычныя памылкі, недакладнасці.

Не думаем, каб Ягора Булычова можна было залічыць да «васьміногаў з капіталістычнага акіяна», што «растуць, як паганыя грыбы, на дражджах мяшчанства» (Ю. Гаўрук). Не кажучы ўжо аб тым, што гэта напісана дрэнна («васьміног расце, як грыб»), — сама па сабе ацэнка Булычова не перадае ўсёй складанасці гэтага чалавечага вобраза і горкаўскага стаўлення да яго.

Наўрад ці можна сказаць, як гэта робіць Ул. Стэльмах, быццам Ніл з «Мяшчан» «мужна і смела змагаецца за свабоду». Наогул можна заўважыць, што на артыкуле Ул. Стэльмаха «Наш Горкі» ляжыць відавочны след паспешлівасці і дэкларатыўнасці. Калі мы, напрыклад, чытаем пра М. Звездачотава ў ролі Булычова, што акцёр «знайшоў свой шлях» да вобраза, што ён «надзяліў яго сваімі рысамі, эмацыянальнымі акцэнтамі, фарбамі», то нам хацелася б дазнацца, якія гэта рысы, акцэнты, фарбы.

Ю. Гаўрук чамусьці называе «Чалкаш» першым апавяданнем Горкага. Між тым да «Чалкаша» былі напісаны, як вядома, такія апавяданні, як «Макар Чудра», «Емяльян Піляй», «Старая Ізергіль», «На солі» і інш.

Адзін і той жа горкаўскі персанаж з «Мяшчан» у І. Баса завецца Бясменавым, у Стэльмаха — Бессяменавым. У сапраўднасці ж ён — Бессяменаў, чалавек «без семені».

Не хацелася б сустракаць у такой кніжцы (ды і ва ўсякай іншай) нязграбную «кальку», накшталт «калектыў, узначальваемы К. Саннікавым», «п'яніцы, не ідучыя далей фраз» і г. д...

Не забудзем: трэба ўсе-такі не «культурнёй», а культу́рней»!

Р. БАРУТА.

«Максім Горкі і Беларусь». Зборнік артыкулаў і ўспамінаў. Выдавецтва «Беларусь». 1968.

«СЭРЦА НА ДАЛОНІ» У ПОЛЬШЧЫ

Польскае выдавецтва «Ксёнжка і ведза» выпусціла ў свет раман Івана Шамякіна «Сэрца на далоні» ў перакладзе Леаніда Сусіда.

Першыя водгукі прэсы сведчаць аб цікавасці польскага чытача да кнігі.

Часопіс «Нова весь» піша што, «раман Шамякіна багаты на драматычныя моманты, напісаны цікава і займальна, паказвае жыццё савецкіх людзей у адным з гарадоў, якіх тысячы, іх штодзённую працу і барацьбу за чысціню адносін, іх настойлівае імкненне вярнуць вялікім словам усё іх значэнне. Шмат увагі прысвячае аўтар справам выхавання моладзі, апісвае цэлую групу юнакоў і дзяўчат, сярод якіх, як і ўсюды, ёсць лепшыя і горшыя і такія, што хочуць лёгка прайсці па жыцці. Старанні бацькоў стварыць умовы грамадскага развіцця, у якіх словы не будуць разыходзіцца са справамі, таксама вынікаюць з клопатаў аб душы маладога пакалення».

А. МАЖЭЙКА.

З пошты ЛіМа

НЕ АБЫ ЯКОЕ ДРЭВА...

Зялёнае ўбранне горада... Гэта і прыгожа, гэта і карысна для здароўя. Дрэвы ж — надзейная заслона ад пякучага сонца, ад пылу, смуроду і г. д.

Скажуць — адкрыў Амерыку. І так усё гэта вядома кожнаму. Праўда. Але завёў я гаворку пра азеляненне не для таго, каб даказваць яго карысць. Ёсць тут і іншыя праблемы.

Па-першае, якія дрэвы трэба садзіць у гарадах? Недасведчаны чалавек на такое пытанне толькі пацісне плячыма, яму няма розніцы, абы дрэвы, абы зелена было. На жаль, так часта думаюць і людзі, якія займаюцца азеляненнем. «Літаратура і мастацтва» ўжо расказвала аб «засіллі» ў нашых гарадах таполі — дрэва, якое хоць і хутка расце, але забруджвае вуліцы пухам.

Дадамо, што захапляюцца ў нас і амерыканскім клёнам. Разам з таполяй ён разрося ў многіх беларускіх гарадах, асабліва ў Баранавічах, Барысаве, Магілёве, Рэчыцы... А між тым, гэтыя дрэвы вельмі небагатыя па фарбах і формах, часта не гарманіруюць з архітэктурнымі ансамблямі.

І вось задаеш сабе пытанне, чаму не прапісаліся дагэтуль у нашых гарадах бяроза, клён, дуб, ясень, вяз, каштан, рабіна і г. д.

У нашых лясах расце рэдкая для многіх раёнаў краіны расліна — брызгліна. Яна б магла ўпрыгожыць любы парк, сквер, вуліцу. Заслугоўвае ўвагі і ядлавец. Але дарма іх шукаць у нашых парках і скверах (хіба толькі выключэнне — гарадскі парк у Гомелі).

У Мінску таксама здзіўляе беднасць парод дрэў. У асноўным гэта ліпа, каштан і таполя. Першыя два пярэчанняў не выклікаюць, яны добра растуць, у розны час цвітуць, па-сапраўднаму ўпрыгожваюць вуліцу. Але ж з поспехам можна было б садзіць і іншыя дрэвы. На адной вуліцы — бярозы, на другой — рабіну, на трэцяй — ясень і г. д. Гэта яшчэ больш упрыгожыла б горад.

У Мінску ёсць адзіная на ўвесь горад бярозавая алея. У Батанічным садзе Акадэміі навук БССР. Той, хто хадзіў па ёй, ведае, якая гэта цудоўная і прыгожая мясцінка. Ёсць там рабінавая алея, яловая. Уявіце сабе, як прыгожа ўсё гэта глядзелася б у гарадскіх скверах, на вуліцах.

Некалькі слоў пра азеляненне нашых мікраёнаў. Ствараецца такое ўражанне, што пры іх пляніроўцы ўлічвалася ўсё, акрамя гэтага. І толькі потым, калі мікраёны пабудаваны, адпаведныя арганізацыі спахапляюцца і пачынаюць хаатычна «азеляняць». Абы чым і абы дзе. Пабывайце, напрыклад, у Мінскім мікраёне «Зялёны луг». Назва прыгожая, ці не так? Але, хіба толькі назва. Увесь мікраён хутчэй шэры, чым зялёны. Некалі тут шумеў лес, сёння ж толькі там-сям чарнеюць кволыя, абадраныя ліпкі.

Тое ж самае можна сказаць і пра нашы дарогі, асабліва новыя. Праедзьце па іх — з абодвух бакоў — тонкія саджанцы той жа таполі і амерыканскага клёна. А чаму б не пераняць вопыт нашых сяброў з сацыялістычных краін, дзе ўздоўж дарог растуць фруктовыя дрэвы. Саджанцаў няма? Ёсць. Толькі ў 1966 годзе ў рэспубліцы засталіся нерэалізаванымі каля мільёна саджанцаў яблынь.

Такім чынам, справа за энтузіястамі. Галоўнае, каб дайшлі рукі, тады ўсё будзе ў парадку.

І. ЧАРНЕНКА.

ЦІ ДРОБЯЗЬ ГЭТА?

Я не буду многа гаварыць у абарону тых, хто збірае значкі. Лічу, што гэтае хобі не горшае за іншыя. Яно і пашырае кругагляд і дае эстэтычную асалоду. Я не кажу ўжо, што праз пэўны час любы значок становіцца своеасаблівым гістарычным дакументам.

А зараз аб справе. Чаму ў нашай рэспубліцы выпускаецца вельмі мала значкоў? Узяць хаця б мінулы год, такі багаты на падзеі — тут 900-годдзе Мінска, 700-годдзе Магілёва, 450 гадоў беларускага кнігадрукавання... Да ўсіх гэтых юбілеяў, праўда, былі выпушчаны значкі. Але іх было так мала, што набыць проста немагчыма.

У нас амаль няма значкоў, прысвечаных памятным мясцінам. Прыедзеш у Прыбалтыку ці на Украіну і проста зайздрасць бяры — тут табе ўсякіх значкоў — і сімвалаў гарадоў, і ў гонар славутых людзей, і гістарычных падзей, і памятных мясцін...

Відаць, там лепш разумеюць, што значкі — не дробязь. Хацелася б, каб зразумелі гэта, нарэшце, і ў нас.

М. ПЛАВІНСКІ.

ПОДЗВІГ ЖЫЦЦЯ

МАРЫЭЦЕ ШАГІНЯН — 80 ГАДОЎ

Марыэта Сяргееўна Шагінян належыць да слаўнай когорты пачынальнікаў савецкай літаратуры, да таго «шчаслівага пакалення», як яна сама назвала яго, якое, «перажыўшы сэрцам дзве рэвалюцыі — 1905-га і 1917-га гадоў», было «назаўсёды абпалена іх свяшчэнным агнём».

Жыццё Шагінян — сапраўдны працоўны подзвіг: на працягу дзесяцігоддзяў таленавіта вядзе яна мастацкі летапіс нашага часу, імкнучыся, каб ні адзін «кавалачак эпохі бясследна не знік з памяці». Раманы Марыэты Шагінян нязменна ўзнікалі на вялікай дакументальнай аснове як апавяданне аб тым, што было ёю ўбачана, перажыта, вывучана. У 1922 годзе яна выступіла з лірыка-эпічным раманам «Перамена», у якім паказала, як «раскалолася зямная цвярдыня» — распалася класавае грамадства. «Перамена» — гэта быль аб грамадзянскай вайне на Доне.

А ў рамане «Гідрацэнтраль» (1931) пісьменніца гаворыць аб планах першай пяцігодкі, аб электрыфікацыі краіны. Гэты твор таксама заснаваны на велізарным фактычным, дакументальным матэрыяле. У дваццатых гадах Марыэта Шагінян вельмі многа ездзіла па Каўказу. І заўсёды паездкі яе былі звязаны з партыйным заданнем, якое мела практычнае гаспадарчае значэнне.

Вось яна карабкаецца па горнаму схілу, каб вывучыць мясцовы будаўнічы матэрыял — артыкскі туф, якому будзе прысвечаны цыкл нарысаў «Узыходжанне на Алагез». Вось паездка на багатыя марганцавыя распрацоўкі ў Чыатурах, якія здадзены ў канцэсію амерыканцам, — пісьменніца ўстанавіла, што, насуперак дагавору, ніякага будаўніцтва яны не вядуць, а «па-варварску рабуюць руду». Баявыя нарысы Марыэты Шагінян дапамаглі ўціхамірыць канцэсіянераў.

Спадарожнікамі і субяседнікамі пісьменніцы ў яе падарожжах былі карабахскія і ларыйскія сяляне, руднічныя рабочыя Зангезура, Чыятур, Ткварчэлі, партыйныя работнікі, геолагі і металургі. Шматлікае народнае асяроддзе акружала Шагінян. Ёй адкрывалася кіпенне справаў, інтарэсаў яе сучаснікаў.

Некалькі гадоў правяла пісьменніца на будаўніцтве гідраэлектрастанцыі ў Ларынамбакскай цясніне на рацэ Дзарагет, у Арменіі. Гісторыя стварэння новага рамана пераплялася не толькі з гісторыяй гэтага будаўніцтва, але і з гісторыяй барацьбы за першы пяцігадовы план.

У падтэксце «Гідрацэнтралі» бурліць магутны паток жыццёвых падзей, непаўторна своеасаблівых, вырваных з самай сарцавіны гісторыі, з кіпучых дзён, калі пачыналася сацыялістычнае будаўніцтва.

У сваіх героях раскрывае Шагінян прагу творчасці: гэта асаблівая «светлая, неспакойная прага, дзіўны шчымлівы сум. Селянін вясной, калі няма чым сеяць, адчувае яго. Сум па нявыкарыстанай у сабе і вакол сябе сіле». І пісьменніца паказвае, што новая грамадская сістэма дае выйсце гэтаму імкненню ствараць. Чалавек, нарэшце, атрымлівае магчымасць выявіць усе свае здольнасці ў рэальнай справе. Гэта галоўная тэма «Гідрацэнтралі» ўвасоблена ў вобразах асноўных герояў: партыйнага работніка Марджана, рабочага Фокіна, філосафа і рамантыка Арно Арэўяна, настаўніцы Ануш Мелхазян.

У публіцыстыцы гэтага часу Шагінян гаворыць аб «пачуцці перавалу», аб тым, што да сучаснага чалавека «прыйшло пачуццё прасторы і свабоды». Пафас «Гідрацэнтралі» — гэта пафас рэвалюцыйных перамен не толькі ў эканоміцы, але і ва ўнутраным свеце чалавека.

Новыя цыклы нарысаў звязаны для Марыэты Шагінян з бурным жыццём краіны. У кнізе «Таямніца трох літар» і іншых нарысах трыццатых гадоў яна расказала аб барацьбе за хлеб і перабудову сельскай гаспадаркі.

У гады Айчыннай вайны пісьменніца едзе на Урал, у Сібір, на Алтай, дзе вядзе вялікую агітацыйна-прапагандысцкую работу. У 1942—1943 гадах друкуюцца яе нарысы «Урал у абароне», якія малююць карціну савецкага ваеннага тылу. А ў 1947 годзе яна зрабіла падарожжа па новабудоўлях Урала, Казахстана, Сібіры і апублікавала нарысы «Па дарогах пяцігодкі», дзе ўслаўляе «разумную, упартую, настойлівую, перспектыўную працу, пранізаную пачуццём будучыні, выразным усведамленнем мэты».

Зарубежныя паездкі пяцідзесятых і шасцідзесятых гадоў выклікалі да жыцця цыклы нарысаў, характэрнай рысай якіх з'яўляецца іх натуральны інтэрнацыяналізм, добрая і жывая цікавасць да культуры, гісторыі краін, у якіх савецкай пісьменніцы давялося пабываць.

Асноўнае месца ў рабоце пісьменніцы апошніх дзесяцігоддзяў займаюць раманы, прысвечаныя Уладзіміру Леніну — «Сям'я Ульянавых» і «Першая Усерасійская». Гісторыя ленінскай сям'і дадзена на фоне рэвалюцыйнага руху Расіі, пачынаючы з шасцідзесятых гадоў мінулага стагоддзя. Пісьменніца супастаўляе факты, адкрывае іх значэнне, унутраную сувязь, узаемадзеянне. І ў выніку прадстае эпоха жывая, ва ўсёй яе непаўторнай своеасаблівасці, з характэрнымі яе героямі, тымі, хто найбольш поўна выявіў свой час.

Неяк пісьменніца прывяла ў сваіх успамінах словы Надзежды Канстанцінаўны Крупскай: «...Жыццё ў мяне склалася выключна шчасліва. Ведаеце, наша пакаленне старых бальшавікоў бачыла ўвесь час, — як усё жыццё карэнным чынам мянялася».

Гэтае шчасце паспытала і сама Марыэта Шагінян, якой давялося быць відавочцай і ўдзельніцай вялікіх гістарычных перамен.

Людміла СКАРЫНА,
літаратурны крытык.
(АДН).

ШЧОДРАЕ ПЯРО

СЦЯПАНУ АЛЕЙНІКУ — 60 ГАДОЎ

Увядомага ўкраінскага паэта-сатырыка Сцяпана Алейніка ёсць верш «Мой друг». У ім з вялікай цеплынёй гаворыцца пра карэспандэнта раённай газеты, журналіста-працаўніка. У любую пару года, пры любых умовах — і ў люты мароз, і ў гарачыню, і ў асенняе бездарожжа — гэты нястомны работнік савецкага друку падарожнічае па вёсках і сёлах «пешкі, на падводзе, у спадарожнай машыне». Ён знаходзіцца ў гушчыні народнага жыцця, добра ведае людзей, іх радасці і клопаты. Як сказана ў вершы: «Дзе трэба — ён крытык, дзе трэба — паэт». Ён радуецца поспехам людзей, як сваім уласным, і блізка бярэ да сэрца розныя няўдачы і непаладкі.

Намаляваны Сцяпанам Алейнікам партрэт савецкага журналіста мае вялікае падабенства з самім паэтам.

Цесная сувязь з народам, кроўная зацікаўленасць у лёсах людзей, глыбокая павага да іх працы, палымянае жаданне зрабіць наша жыццё больш шчаслівым і радасным і побач з гэтым непрымірымае стаўленне да ўсяго варожага, коснага і адсталага — вось характэрныя рысы творчасці Сцяпана Алейніка.

Ва ўкраінскіх і маскоўскіх выдавецтвах выйшла больш трыццаці зборнікаў яго вершаў. У іх прадстаўлены ўсе жанры, падуладныя шчодраму пяру Сцяпана Алейніка, — лірыка, карціны побыту, публіцыстыка, сатыра і гумар.

У вершах Алейніка жывуць і дзейнічаюць прадстаўнікі розных прафесій — кавалі, трактарысты, агрономы, шафёры, садаводы, шахцёры. Можна было б назваць мноства яго вершаў, дзе дадзены запамінальныя ўзоры сапраўдных «гаспадароў зямлі», як яны з гонарам сябе называюць.

Поспех вершаў Сцяпана Алейніка аб добрых савецкіх людзях у значнай ступені абумоўлены тым, што напісаны яны весела і натуральна, асветлены добрай усмешкай аўтара.

Многімі жанрамі валодае Сцяпан Алейнік, але самымі характэрнымі ў яго творчасці, па агульнаму прызнанню, з'яўляюцца сатыра і гумар, дзе з найбольшай сілай выявіліся арыгінальнасць і самабытнасць паэта. У яго мы знаходзім усе адценні бытавога народнага ўкраінскага гумару, то добразычлівага і паблажліва-дабрадушнага, то хітраватага, то іранічнага і насмешлівага, то з'едлівага і бязлітаснага.

У сатырычных вершах паэта дадзена шырокая галерэя адмоўных тыпаў і характараў. Бюракраты ўсіх масцей і рангаў, раскрадальнікі грамадскай уласнасці, гультаі, ваяўнічыя мяшчане і многія іншыя носьбіты буржуазных перажыткаў знайшлі сваё месца ў сатырычнай галерэі Сцяпана Алейніка. У вершах на зарубежныя тэмы злосна і едка высмеяў ён украінскіх нацыяналістаў, якія дажываюць свае бясслаўныя дні на капіталістычных задворках.

Заслугоўвае асаблівай увагі сама форма фельетонаў Алейніка. Многія з іх — невялікія апавяданні ў вершах. У іх ёсць сюжэт, жыццёвыя сутыкненні і канфлікты, характарыстыкі герояў даюцца не прама ад аўтара, а раскрываюцца ў дзеянні.

У апошнія гады побач з вершамі Алейнік піша і прозу. У 1965 годзе ў выдавецтве «Советский писатель» выйшаў зборнік яго біяграфічных апавяданняў «З кнігі жыцця». У іх мы знаёмімся з людзьмі, якіх аўтар ведаў і з якімі сутыкаўся на працягу многіх гадоў. Работу над творамі біяграфічнага характару Сцяпан Алейнік працягвае і зараз.

Дарэчы, трэба сказаць аб некаторых біяграфічных вехах самога паэта.

Нарадзіўся ён у сялянскай сям'і і перш чым стаць прафесіянальным пісьменнікам, прайшоў вялікі працоўны шлях. Пачаўшы друкавацца ў 1929 годзе, многа супрацоўнічаў ва ўкраінскіх газетах і часопісах і толькі ў 1947 годзе выпусціў першы зборнік вершаў «Мае землякі».

У час Вялікай Айчыннай вайны, з снежня 1941 года і да разгрому гітлераўцаў пад Сталінградам, працаваў у газеце «Сталинградская правда». Пісаў вершы і нарысы аб воінах Сталінграда, аб рабочых і калгасніках, якія дапамагалі фронту.

З 1946 года і па сучасны момант — пастаянны супрацоўнік і член рэдкалегіі ўкраінскага сатырычнага часопіса «Перац».

За сваю літаратурную працу С. Алейнік узнагароджан двума ордэнамі Леніна, ён лаўрэат Дзяржаўнай прэміі. Побач з літаратурнай дзейнасцю Алейнік вядзе вялікую грамадскую работу. Ён дэпутат Вярхоўнага Савета СССР шостага і сёмага скліканняў, член праўлення Саюза пісьменнікаў СССР.

Сяргей ШВЯЦОЎ,
паэт (АДН).

ТАКАЯ ЗЯМЛЯ НАША

КРАЯЗНАЎСТВА — ГЭТА ВЫХАВАННЕ

Такая зямля наша: на кожным кроку, у кожным кутку яе — сляды подзвігу народнага.

Аршаншчына. Праз смугу стагоддзяў легенды і песні данеслі подых гераічнай барацьбы аршанцаў супраць іншаземных захопнікаў. Ганарыцца наш край рэвалюцыянерамі — змагарамі за народнае шчасце, удзельнікамі Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Айчыннай войнаў, героямі мірнага будаўніцтва.

Але яшчэ многае з гераічнага мінулага нашай зямлі малавядома, а то і проста невядома. І час працуе не на нас: забываюцца імёны, зарастаюць безымянныя магілы, гінуць дакументы... Адным словам, для пошуку, для даследавання ў нас самае шырокае поле дзейнасці. Мне хочацца расказаць тут пра работу нашых юных следапытаў.

Гонар нашай школы — краязнаўчы музей баявой і працоўнай славы. У ім звыш 3500 экспанатаў — фотаздымкаў, дакументаў, пісьмаў, дзённікаў і г. д. Усе сабраны ў час пошукаў, у час паходаў па былых партызанскіх сцежках, па месцах баёў з гітлераўцамі.

Аднойчы нас зацікавіў такі факт: за адзін дзень баёў 26 чэрвеня 1944 года за мужнасць і ўзорнае выкананне заданняў камандавання пры акружэнні фашысцкага гарнізона ў Оршы сямі воінам былі прысвоены званні Герояў Савецкага Саюза — Сяргею Міхайлавічу Міту, Паўлу Аляксандравічу Волкаву, Дзмітрыю Рыгоравічу Фролікаву, Паўлу Іванавічу Назаранку, Цімафею Іванавічу Святлічнаму, Сяргею Дзмітрыевічу Барадуліну, Мікалаю Міхайлавічу Лазько. Мы вырашылі падрабязней даведацца пра герояў, тым больш, што трое — С. Міт. Д. Фролікаў і П. Волкаў — здзейснілі свае подзвігі паблізу таго месца, дзе зараз стаіць наша школа.

У баі за пераправу праз раку Адроў танкавы экіпаж гвардыі лейтэнанта Сяргея Міхайлавіча Міта цаной жыцця авалодаў пераправай, забяспечыў фарсіраванне рэчкі і акружэнне фашысцкага гарнізона ў Оршы. Следапыты знайшлі месца пахавання С. М. Міта і членаў яго экіпажа, адшукалі родзічаў герояў-танкістаў, сабралі фотаздымкі, біяграфічныя звесткі пра іх, устанавілі сувязі з іх баявымі сябрамі. Да нас у школу прыязджала жонка героя — Э. П. Міт. Яна перадала ў падарунак школьнікам альбом аб Ленінградзе, дзе жыў С. М. Міт, фотакопію граматы героя і альбом з відамі ленінскіх месц у Ленінградзе.

У школе свята ўшаноўваюць памяць аб гераічным экіпажы. Лепшы піянерскі атрад носіць імя С. М. Міта. У кутку «Баявой славы» праводзіцца прыём у піянеры, у камсамол. Аддаючы даніну павагі подзвігу Героя Савецкага Саюза С. М. Міта і працы нашых следапытаў, Савет Міністраў БССР прысвоіў нашай школе імя героя.

Збіраючы матэрыялы аб подзвігу С. М. Міта, юныя следапыты адшукалі яшчэ двух герояў — аднапалчан Міта П. А. Волкава і Д. Г. Фролікава, якія таксама вызвалялі Аршаншчыну. Было ўстаноўлена, што танк, які стаіць у Мінску ля Дома афіцэраў і які першым уварваўся ў 1944 годзе ў сталіцу рэспублікі, належаў экіпажу Фролікава. На гэтым танку ён гераічна змагаўся за вызваленне нашага раёна, за што яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У школьным краязнаўчым музеі сабраны таксама матэрыял аб партызанскім руху на Аршаншчыне. Нам прыслалі ўспаміны аб баявых справах партызан камбрыгі Г. А. Керпіч, М. П. Гудкоў, М. А. Рашэтнікаў, Герой Савецкага Саюза Сяргей Рыгоравіч Жунін і наш зямляк Ілья Паўлавіч Кожар — камандзір Гомельскага партызанскага злучэння.

На Аршаншчыне ў складзе 16 Смаленскага партызанскага палка ваяваў Міхаіл Ягораў, будучы герой штурму рэйхстага. На Аршаншчыне ў брыгадзе «Чэкіст» змагаліся Герой Савецкага Саюза Мамадалі Тапавалдыеў, адважная партызанка-піянерка Вольга Дземіш, якой прысвечана аповесць М. Корзуна «Навальнічная паласа». З імі следапыты таксама ўстанавілі сувязь. У час турысцкіх паходаў сабраны матэрыялы і фотаздымкі аб подзвігах юных партызан-заслонаўцаў Васі Стаброўскага і Колі Кірыка.

Традыцыйным стала ў школе правядзенне дзён мужнасці, прысвечаных памяці загінуўшых выхаванцаў і настаўнікаў школы. Загадам дырэктыўі 32 былыя выхаванцы і 3 настаўнікі навечна залічаны ў спісы школы. Сярод іх былы дырэктар школы С. А. Масалкоў — партызан брыгады «Чэкіст», які загінуў у 1942 годзе, партызан А. З. Кучынскі, які, будучы параненым, падпусціў да сябе фашыстаў і падарваў сябе і ворагаў гранатай, партызанка Людміла Стахоўская, якую закатавалі фашысты. Сярод загінуўшых нашых выхаванцаў удзельнікі баёў за Кіеў і Адэсу, Сталінград і Кішынёў, Вільнюс і Мінск, Севастопаль, Маскву і Ленінград, за вызваленне Польшчы і Чэхаславакіі.

У пачатку навучальнага года на першым уроку ў кожным класе настаўнік называе прозвішчы тых, хто загінуў і занесен навечна ў спісы класа. Ва ўрачыстай цішыні гучыць голас дзяжурнага:

— Загінуў смерцю храбрых у барацьбе супроць фашыстаў за нашу Савецкую Радзіму.

Увесь першы ўрок класныя кіраўнікі прысвячаюць расказу пра герояў.

Я ведаю, што ў некаторых школах бывае так: вучэбны працэс сам па сабе, а работа следапытаў, іх пошукі, знаходкі — самі па сабе, мауляў, пазашкольная самадзейнасць. У нас усё гэта цесна пераплялося. На ўроках, лекцыях выкарыстоўваюцца матэрыялы, знойдзеныя краязнаўцамі. У сваю чаргу настаўнікі дапамагаюць следапытам, накіроўваюць іх пошук.

Наш музей ператварыўся ў своеасаблівы кабінет, лабараторыю, дзе вучні вывучаюць гісторыю роднага краю. Так, у музеі праводзяцца ўрокі на тэмы: «Вялікая Айчынная вайна», «Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя», «Утварэнне БССР», калектывізацыя, грамадзянская вайна. Шырока прадстаўлен у музеі і матэрыял аб дасягненні працаўнікоў сельскай гаспадаркі Аршаншчыны, калгаснікаў падшэфнага калгаса «Адроўка», аб працоўных справах былых выхаванцаў школы. Лепшым з лепшых нашых былых вучняў прысвечан стэнд «Іх выхавала школа і ганарыцца імі».

Ёсць у нашым музеі і куток інтэрнацыянальнай дружбы, дзе прадстаўлены матэрыялы, атрыманыя ад ветэранаў палка «Нарманды—Нёман», удзельнікаў вызвалення Аршаншчыны. Тут экспанаваны таксама паштоўкі, альбомы, манеты, значкі, прысланыя нашым вучням з многіх краін свету.

У музеі шмат матэрыялаў, прысвечаных жыццю і дзейнасці У. І. Леніна. Зараз краязнаўцы працуюць над зборам матэрыялаў на тэму: «Імя Леніна на Аршаншчыне». Часты госць школьнікаў — ганаровы піянер дружыны, былы выхаванец школы, удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый і грамадзянскай вайны, пенсіянер Сяргей Сцяпанавіч Раманоўскі, які слухаў прамову Ільіча ля Фінляндскага вакзала.

Наш музей наведваюць турысты з многіх школ Аршанскага, Талачынскага раёнаў, калгаснікі навакольных вёсак, бацькі нашых навучэнцаў.

Цяпер трошкі пра нашыя планы ў сёлетнім юбілейным годзе. Летам праядзём паходы пяці турысцкіх атрадаў па месцах баявой славы, збяромся на турысцкі злёт каля магілы С. М. Міта, зробім экскурсію ў Брэсцкую крэпасць. На сродкі, сабраныя за здадзены металалом, мяркуем паставіць каля школы абеліск настаўнікам і выхаванцам школы, што загінулі ў час вайны. На абеліску будзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка з імёнамі загінуўшых.

Юныя следапыты пільна берагуць памяць бацькоўскіх подзвігаў.

К. САЎЧАНКА,
выкладчык гісторыі, кіраўнік гісторыка-краязнаўчага гуртка Роска-Сялецкай сярэдняй школы імя С. М. Міта Аршанскага раёна.

ВОБРАЗНАЯ МОВА ІНТЭР'ЕРА

АБМЕРКАВАННЕ Ў САЮЗЕ АРХІТЭКТАРАЎ БССР

У САЮЗЕ архітэктараў БССР абмеркаваны пытанні, якія маюць важнае значэнне для развіцця сінтэзу архітэктуры і манументальнага мастацтва. Гаворка ішла аб інтэр'ерах, выкананых у апошні час маладой праектнай арганізацыяй — «Белгіпрагандлем».

Пасля агляду новых інтэр'ераў у магазінах «Алеся» на Паркавай магістралі, «Сувеніры» ля гасцініцы «Беларусь», «Падпісныя выданні», «Васілёк», «Ювелірны» на Ленінскім праспекце ўдзельнікі абмеркавання — архітэктары, мастакі, прадстаўнікі грамадскасці і прэсы — сабраліся ў Мінскім Доме архітэктара.

Галоўны архітэктар «Белгіпрагандлю» Г. Сысоеў расказаў аб задумах архітэктараў, якія стваралі і абнаўлялі памяшканні магазінаў, аб тым, як ішлі пошукі цэльнасці, гармоніі колераў, зручнага размяшчэння тавараў, месц для прадаўцоў, дакладнай і прыгожай рэкламы. Сёння, падкрэсліў ён, ставяцца і задачы дасягнення пэўнага мастацкага вобраза інтэр'ера, індывідуальнага аблічча гандлёвых устаноў. Часта пры гэтым архітэктары выходзяць з самой спецыфікі магазінаў, акрэсленай ужо ў назвах (напрыклад, «Алеся», «Васілёк»).

На гэтым шляху ў нас ужо ёсць пэўныя поспехі. Мастак А. Сурскі, галоўны архітэктар Маскоўскага праектнага інстытута Цэнтрасаюза Г. Аквілеў, галоўны архітэктар «Мінскпраекта» Н. Шпігельман, старшыня Дзяржбуда БССР Ул. Кароль і іншыя адзначылі высокі ўзровень мастацкага вырашэння інтэр'ераў, пра якія ішла гаворка.

— Новыя інтэр'еры, — сказаў, напрыклад, Г. Аквілеў, — сучасныя, зроблены з густам і могуць «спаборнічаць» з лепшымі інтэр'ерамі магазінаў Масквы. Беларускія архітэктары бліскуча справіліся з нялёгкай задачай, хоць новыя інтэр'еры і стваралі ў старых дамах. Бездакорна вырашаны магазін «Сувеніры», цэльны мастацкі вобраз у магазіне «Падпісныя выданні». Някепска выглядае інтэр'ер «Васілька», перабудоўваць які было досыць складана — удала ўпісаны ў старое памяшканне новае абсталяванне, дэкаратыўныя элементы. Цікавая апрацоўка сцен і своеасаблівая падвесная столь у магазіне «Ювелірны». З густам, удала з пункту гледжання экспазіцыі тавараў вырашаны інтэр'ер магазіна «Алеся».

На абмеркаванні былі прааналізаваны і недахопы ў вырашэнні інтэр'ераў. У магазіне «Сувеніры», як адзначыў А. Сурскі, недастатковая якасць падвеснай столі, у «Ювелірным» — немаштабная, надта дробная дэкаратыўная кераміка ў спецыяльных нішах.

Г. Аквілеў гаварыў пра недастатковую асветленасць магазінаў — увечары яго трэба ўзмацніць. Ён адзначыў таксама, што для зручнасці наведвальнікаў у «Падпісных выданнях» варта было б паставіць часопісныя сталы, крэслы і пюпітры для чытання стоячы.

Былі выказаны заўвагі і пра колер у інтэр'еры. Так, у магазіне «Алеся» колерная палітра стрыманая, высакародная, аднак варта навучыцца прымяняць і некідкі лакальны колер. Н. Шпігельман звярнуў увагу на тое, што сёння ўдзяляецца ўвага ў асноўным толькі інтэр'ерам у цэнтры горада, а стварэнне інтэр'ераў магазінаў у мікрараёнах пастаўлена, як гаворыцца, «на паток».

Удзельнікі нарады паставілі пытанне пра неабходнасць вырашэнняў інтэр'ераў у спецыялізаваных праектных інстытутах, падобных «Белгіпрагандлю». Асаблівую ж увагу прамоўцы ўдзялілі сінтэзу мастацтваў. Творы выяўленчага мастацтва, тактоўна ўпісаныя ў архітэктурнае акружэнне, узбагачаюць яго, дапамагаюць стварыць дакладны і выразны вобраз. Арганічна «ўвайшлі» ў шэрую бархацістую паверхню сцен магазіна «Сувеніры» чорныя керамічныя пліткі з белымі графічнымі лініямі стылізаваных малюнкаў, выкананых мастаком В. Гаўрылавым і архітэктарам Я. Цвінгелем. На высокім мастацкім узроўні вырашаны керамічныя мазаікі ў магазіне «Васілёк» (архітэктар Г. Сысоеў, мастакі Л. Цераховіч і Э. Шчаглоў). Арганічна ўвайшла ў інтэр'ер «Ювелірнага» металапластыка.

Аднак якраз пры стварэнні інтэр'ераў сустракаюцца найвялікшыя цяжкасці. І загваздка не толькі ў тым, што мы яшчэ недастаткова добра авалодалі, калі так можна сказаць, «тэхнічнымі прыёмамі» сінтэзу мастацтваў: архітэктурнае рашэнне ў нас часцей за ўсё вышэй мастацкага. Справа яшчэ і ў тым, што мастакі ў большасці выпадкаў прыступаюць да работы толькі тады, калі ўжо завершана архітэктурнае праектаванне. Яны, вядома, не могуць арганічна ўключыцца ў работу, зразумець задуму архітэктара — і часта ствараюць чужароднае для новага інтэр'ера. Такое можна, напрыклад, бачыць у фае кінатэатра «Піянер», дзе дэкаратыўнае пано немаштабнае.

— Чаму так адбываецца? — паставіў пытанне Н. Шпігельман і паспрабаваў знайсці адказ: — Нярэдка не тэма «захоплівае» мастака, а мастак тэму. Ён не думае над тым, што больш стасуецца да таго ці іншага канкрэтнага інтэр'ера, а выбірае тэхніку выканання, якая прынясе яму большы... прыбытак. І гэта прыводзіць да пераважання ў нашых інтэр'ерах на сценах дарагіх і несучасных «узораў жывапісу». І вельмі мала ў нас металапластыкі, чаканкі, вітражоў, маёлікі. Мастакі, на жаль, тут не эксперыментуюць, не шукаюць новыя матэрыялы, новыя мастацкія формы, якія можна было б арганічна спалучаць з новай архітэктурай. Ленінградцы, напрыклад, прапанавалі новы метад «пісьма» — апрацоўку бетонных сцен агнём, што дае прыемную, адмысловую па гучанню колерную гаму, а ў нас не карыстаюцца гэтай цудоўнай тэхнікай, таму што... няма расцэнак на гэты від работ!..

Больш таго, кіраўніцтва Мастацкага фонду БССР не толькі не прымае захады, каб мастакі пашырылі арсенал мастацкіх сродкаў пры іх сумеснай працы з архітэктарамі, але, выступаючы ў ролі падрадчыка, часта спрабуе, як адзначыў Г. Сысоеў, дыктаваць свае ўмовы, навязваць прапановы, якія пярэчаць задуме агульнага архітэктурнага вырашэння (так здарылася, напрыклад, пры стварэнні магазінаў «Васілёк», «Падпісныя выданні»).

Якое ж выйсце са становішча?

Г. Аквілеў адзначыў, што ўдалы метад супрацоўніцтва, які прымяніў «Белгіпрагандаль», прыняўшы групу мастакоў на штатную работу.

Старшыня Дзяржбуда БССР Ул. Кароль, галоўны архітэктар «Мінскпраекта» Н. Шпігельман, мастак А. Сурскі і іншыя паставілі пытанне пра арганізацыю спецыяльных майстэрань, якія займаліся б сінтэзам мастацтваў. Такія майстэрні маглі б быць створаны пры Саюзе архітэктараў БССР. Тут, пачынаючы з самага зараджэння праекта, маглі б працаваць плячо да пляча архітэктары і мастакі, дабіваючыся поўнага зліцця архітэктурных і выяўленчых элементаў, арганічнага сінтэзу, пры якім цяжка вызначыць, дзе канчаецца работа архітэктара і пачынаецца работа мастака. У спецыяльных майстэрнях можна было б таксама займацца ў цэнтралізаваным парадку святочным афармленнем гарадскіх вуліц і плошчаў, вырашэннем помнікаў і цэлых мемарыяльных комплексаў — з поспехам выконваюць работу, якая сёння там-сям пушчана амаль на самацёк. У такіх майстэрнях на гаспадарчым разліку маглі б у вольны ад асноўнай работы час працаваць і архітэктары праектных інстытутаў, ствараючы эксперыментальныя праекты. Дарэчы, падобнага тыпу майстэрні існуюць, напрыклад, у сацыялістычных краінах, яны ствараюцца ў Армянскай ССР.

Пытанне аб сінтэзе мастацтваў — не простае. І, думаецца, што правільнае вырашэнне закранутых у час абмеркавання ў Саюзе архітэктараў праблем створыць добрыя ўмовы плённага яго вырашэння.

В. ГОВАР.

АБ'ЕКТЫЎ ДАСЛЕДУЕ ЖЫЦЦЁ

Мы не раз бачылі квантуху з курынятамі і чулі прызыўныя курынага сямейства. А вона кінааб'ектыва здолела паглядзець новую і нечаканую таямніцу. Аказваецца, маці кіруе курынятамі, яшчэ да іх «нараджэння», калі яны ў шкарлупе. Заклікае іх да цішыні ў хвіліну небяспекі, падае каманду, калі настае час выходзіць са шкарлупы на волю. А піск курынят, аказваецца, іх своеасаблівая «мова». Аб гэтым наглядна сведчыць просты, але пераканаўчы дослед, які назіраеш на экране.

Мы расказалі аб адным з многіх эпізодаў новага навукова-папулярнага фільма «Мова жывёл», пастаўленага па сцэнарыі Юрыя Алікава рэжысёрам Фелінсам Собалевым. Здымкі ў вельмі складаных умовах былі ажыццёўлены галоўным аператарам Леанідам Прадкіным. Каляровая стужка дае нам магчымасць далучыцца ад адной з таямніц прыроды.

Незвычайна цікавыя і павучальныя кадры аб перадачы жыхарамі падводнага царства сігналаў адзін аднаму. Вось поўны грацыі і своеасабліва пластычны шлюбны танец марскіх пеўнікаў, якому папярэднічае жорсткі бой самцоў за будучую сяброўку.

А вось дэльфіны. Гуляючы з дрэсіроўшчыкам, які нахіліўся да вады, яны ласкаюць, «цалуюць» яго. І ў знак асаблівай прыхільнасці адзін з іх асцярожна выносіць з вады і дорыць сябру-чалавеку свой ласункак — рыбу. «Становіцца іншы раз крыху жахліва,— жартуюць стваральнікі фільма, — як быццам не тольки мы, але і яны нас вывучаюць...»

Удзельнікі здымачнай групы на працягу года пабывалі ў розных кутках краіны, па драбінцы збіраючы матэрыял для карціны. Вось што расказвае рэжысёр Фелінс Собалеў:

— У Сухумскім малпавым гадавальніку нас асабліва зацікавілі павіяны-гамадрылы. Шмат часу давялося правесці з малпамі ў вальеры. Цэлымі днямі прывучалі іх да сябе, кармілі, песцілі, проста назіралі, пакуль звяры не прывыклі настолькі, што перасталі нас заўважаць. І толькі тады мы пасапраўднаму прыступілі да работы.

У Сухумі мы знялі каштоўнейшыя кадры не толькі для нашай карціны, але і для навуковых супрацоўнікаў гадавальніка.

Вельмі цікава было здымаць пчол. Навуковыя супрацоўнікі Інстытута заалогіі Акадэміі навук УССР Іван Леўчанка і Леанід Францэвіч дапамаглі нам зняць на плёнку вельмі складаныя і цікавыя моманты жыцця гэтых насякомых. Напрыклад, знята пчала ў палёце. Цяжкасць у тым, каб прымусіць пчалу ляцець перад аб'ектывам на адлегласці не больш двух сантыметраў. З 60 спроб удаліся пяць. З гэтых кароткіх кадраў мантажор Таццяна Дубенка і зманціравала эпізод палёту пчалы.

Галоўны аператар Леанід Прадкін сканструяваў спецыяльныя «паляўнічыя» доўгафокусныя аб'ектывы. З іх дапамогай было знята рэдкае і надзвычай прыгожае відовішча — шлюбны танец лебедзяў, спяваючы салавей і многае іншае.

Людзі павінны вучыцца разумець «мову» істот, якія жывуць з імі побач, на адной планеце. Аб гэтым нагадвае фільм украінскіх кінематаграфістаў.

Ніна ШАУЦОВА.
(АДН).

ПА ДЭ БУРЭ ЛЕБЕДЗЯ.

Фотаэцюд Р. КАДЗЕТА.

СХОД СЕКЦЫІ ДРАМАТУРГІІ СП БССР

Адбыўся справаздачна-выбарчы сход секцыі драматургіі Саюза пісьменнікаў БССР. Пасля кароткай прамовы старшыні секцыі А. Маўзона і агляду творчай дзейнасці драматургаў рэспублікі ў мінулым годзе, які зрабіў К. Губарэвіч, пачаліся спрэчкі.

З вялікай заклапочанасцю прамоўцы гаварылі пра сучасны стан літаратуры для тэатра, пра паток даволі пасрэдных п'ес, што часам прабіваюцца на падмосткі, пра тое, што рэдка яшчэ нашы тэатры прысвячаюць сваю працу з аўтарамі праблемнай і маштабнай драматургіі. Узнімаліся і пытанні сувязей паміж секцыяй і Упраўленнем па справах мастацтваў Міністэрства культуры БССР, БТА, літаратурнымі часткамі тэатраў. Выказваліся пажаданні, каб на сцэнах нашых тэатраў да 50-годдзя Беларускай ССР і КПБ ставіліся і лепшыя творы мінулага, у яніх адлюстраваны падзеі грамадзянскай вайны і першых мірных гадоў маладой Савецкай Беларусі.

У спрэчках выступілі І. Шамякін, А. Вольскі, П. Васілеўскі, А. Бачыла, А. Сабалеўскі, Г. Колас, Р. Кобец, заслужаны артыст БССР Ю. Сідараў, галоўны рэжысёр ТЮГ'а Б. Ганага, рэжысёр акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы Б. Луцэнка і дырэктар гэтага тэатра П. Лютаровіч.

Абраны новы склад бюро секцыі. Старшынёй яго выбраны А. Макаёнак, намеснікам старшыні — А. Дзялендзік, сакратаром — Г. Колас.

У МАГІЛЁЎСКІХ ЛІТАРАТАРАЎ

Адбыўся справаздачна-выбарчы сход Магілёўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Аб рабоце аддзялення расказаў яго сакратар Пётр Шасцерыкоў. У спрэчках выступілі Васіль Матэвушаў, Аляксей Пысін, Міхаіл Шумаў, Янка Тарасаў, Георгій Фралоў і іншыя.

У рабоце схода прынялі ўдзел сакратары праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Іван Шамякін і Мікола Ткачоў, рэдактар часопіса «Полымя» Павел Кавалёў, загадчык аддзела абкома КПБ І. Ф. Сіяпанаў.

Сакратаром аддзялення выбраны Пётр Шасцерыкоў.

ЮБІЛЕЙ ВЫКЛАДЧЫКА

Павагай і аўтарытэтам карыстаецца ў пінчан выкладчык музычнай школы Баграт Айрапетавіч Мнацаканян. Споўнілася сорак гадоў яго педагагічнай дзейнасці. У Пінскім Доме культуры ў сувязі з гэтым адбыўся вечар. Юбіляра віталі загадчык гарадскога аддзела культуры І. Збароўскі, начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення культуры М. Шаўчук, калегі па рабоце. Б. Мнацаканяну ўручаны значок Міністэрства культуры СССР «За выдатную работу».

Баграт Айрапетавіч кіруе хорам хлопчыкаў і хорам настаўнікаў Пінска, прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце.

Л. ЛЕАНАВЕЦ.

КІНО І МУЗЫКА

Гутарка з народным артыстам РСФСР, лаўрэатам Ленінскай прэміі, кампазітарам Васіліем САЛАЎЁВЫМ-СЯДЫМ

Імя і песні Васілія Салаўёва-Сядога вядомы настолькі добра, што не патрэбны спецыяльныя рэкамендацыі. Такая ж папулярная і яго работа ў кіно, з якім ён звязаны на працягу многіх гадоў. Ён напісаў музыку да дзесятнаў ігравых і дакументальных фільмаў. Мы папрасілі кампазітара адказаць на некалькі пытанняў, звязаных з праблемай узаемаадносін музыкі і кінематографа.

— Якая, па-вашаму, галоўная функцыя музыкі ў кіно?

— Выказаць тое, што іншымі сродкамі выказаць немагчыма. Менавіта таму музыка—раўнапраўны кампанент фільма, а не ілюстрацыя, ні ў якім разе не ілюстрацыя. Успомніце, як узбагачае нашы адчуванні, дапамагае раскрыццю задумы песня Майсея Вайнберга ў фільме «Апошні дзюйм». Цяжка ўявіць сабе зараз карціны «Чалавек ідзе за сонцам» і «Мой малодшы брат» без музыкі Міхаэла Тарывердзіева. «Баладу аб салдаце» — без музыкі Міхаіла Зіва, «Цячэ Волга» — без цудоўнай песні Марка Фрадкіна. Тут музыка непарыўна звязана з адлюстраваннем, мае драматургічныя функцыі. Калі ж яна тармозіць дзеянне, адрывае ад яго, значыць, кампазітар, нават напісаўшы сам па сабе цікавы твор, занядбаў спецыфіку кіно.

Вядома, найбольшая прастора для кампазітара — у музычным фільме, дзе напісанае ім дыктуе тое ці іншае выяўленчае рашэнне. Найбольш яскравыя прыклады гэтага, на жаль, адносяцца да даваенных гадоў: «Волга-Волга» і «Вясёлыя хлопцы». У іх у аснове сюжэта—музыка, якая, натуральна развіваючыся, дае вялікае задавальненне. Другі прыклад — «Вялікі вальс», у якім востра і добра выкарыстана музыка Штрауса. Нарэшце, у апошнія гады мы сталі сведкамі нараджэння новага жанру, на мой погляд, вельмі перспектыўнага: я маю на ўвазе такія карціны, як «Вестсайдская гісторыя» і «Шэрбурскія парасоны».

Калі ж гаварыць аб маёй рабоце, дык бліжэй за іншыя да музычнага фільма быў «Нябесны ціхаход» і частковa «Першая пальчатка». Там як быццам удалося дабіцца арганічнага развіцця музычных тэм, песна ўзаемазвязаных з рухам сюжэта.

— Зараз нярэдка кампазітары пішуць да фільмаў канкрэтную музыку. Як вы ставіцеся да гэтага?

— Як правіла, новыя складаныя гарманічныя спалучэнні прыходзяць у музыку як характарыстыкі сарказму, агіднасці, жаху. Толькі шмат часу пасля яны пачынаюць пранікаць у лірычную музыку. На пачатку кінематографа гналіся за прыгожымі тварамі, наогул за ўсім знешне прыгожым. Зараз іншае. Кіно прыйшло да вялікага рэалізму, глыбейшыя сталі вобразы, яго цікавіць духоўны свет чалавека, а не знешняя прыгажосць. Тое самае датычыцца і музыкі для кіно, якая павінна мяняцца разам з ім. Зразумела, сродкі пры гэтым могуць быць самыя розныя. І хоць я не прыхільнік канкрэтнай музыкі, але лічу, што ў акцэнтоўных асобных палажэннях яна можа быць выкарыстана.

— Некалькі гадоў назад мы бачылі дакументальную стужку «Біп застаецца ў Ленінградзе». Гэта карціна пра вялікага міма Марселя Марсо. Пантаміма перш за ўсё — бязмоўная, а калі суправаджаць яе музыкай, дык, нам здаецца, рабіць гэта трэба з вялікім тактам, захоўваючы пачуццё меры. А тут музыка аглушала, яна гучала амаль няспынна. Скажам, эпізод, дзе Марсо з узрушальнай сілай паказвае дуэль і смерць Пуп'іна, аўтары агучылі раптам фрагментам з Першага фартэпіяннага канцэрта Чайкоўскага. Вобразы відавы і музычны ўступілі ў рэзкую супярэчнасць. Відаць, не так далёка ад ісціны была рэжысёр Наталля Сац, якая жартам прапанавала на Трэцім з'ездзе кампазітараў стварыць таварыства па ахове Першага фартэпіяннага канцэрта ад кінарэжысёраў.

Мы закранулі вельмі вялікае пытанне. Сапраўды, з музыкай у дакументальным кіно далёка не так, як хацелася б. Неўпапад — з-за нейкай незразумелай нецярпімасці да цішыні — аўтары многіх дакументальных стужак агучваюць іх і класікай, і творамі савецкіх кампазітараў. Выпрацаваліся нават своеасаблівыя каноны. Калі, напрыклад, на экране паказваюць будоўлю, дык часцей за ўсё чамусьці выкарыстоўваюцца кавалкі з фартэпіянных канцэртаў Рахманінава. А ўжо пра канцэрт Чайкоўскага я і не кажу — яго літаральна расцягнулі па нотках у розных фільмах.

З-за такіх адносін некаторых дакументалістаў да музыкі мы ўжо амаль адвыклі ад таго, што кіно можа быць і нямым, што іншы раз цішыня проста неабходная. Калі рэжысёр раптам адважваецца даць цішыню, у зале тут жа крычаць «Гу-у-к!» Я сам бываў сведкам гэтага. Слова гонару, нельга ж усюды—трэба ці не трэба — насільна ўціскваць музыку. Падбіраць яе трэба з вялікім густам, а яшчэ лепш, каб музыка ў дакументальным фільме была арыгінальная, напісаная спецыяльна для яго.

— З практыкі вядома, што ўзаемаадносіны тых, хто робіць фільмы, і тых, хто піша да іх музыку, часам складваюцца далёка не проста. Чым гэта тлумачыцца?

— Адбываецца вось што (я маю на ўвазе ігравыя карціны). Калі фільм яшчэ толькі рыхтуюць, кампазітару прапануюць старанна распрацаваць музычную эксплікацыю. Потым рэжысёр здымае. А кампазітар, згодна з эксплікацыяй, піша. Настае мантажна-таніровачны перыяд. Рэжысёр у парыве творчага натхнення (гэта ні ў якім разе не іронія) пераманцірує матэрыял. Але пры гэтым ён нярэдка зусім не ўлічвае, што музыка, якую напісалі загадзя, аказваецца ў вельмі невыгодным становішчы. Яе абразаюць, кладуць не на тыя эпізоды і гэтак далей. Вынік вядомы. Замест таго, каб паглыбляць драматургію фільма, садзейнічаць раскрыццю характараў, музыка ў лепшым выпадку проста не перашкаджае. А часта і перашкаджае.

Прыяжджаю некалькі прыкладаў з уласнай практыкі. Я напісаў у свой час на словы Мікалая Глейзарава лірычную песню для мастацкай карціны аб працоўных рэзервах — «Насустрач жыццю». Вось яе пачатак.

Вечер настал, не качнется камыш,
Вспыхнул вдали огонек,
Что ты над речкой сидишь
и грустишь,
Что ты молчишь, паренек?

З гэтага характар песні зразумелы, зразумелыя і выяўленчыя сродкі: плаўны, павольны рух камеры, спакойны кадр. Так і меркавалася. Але потым хтосьці сказаў рэжысёру, што трэба паказаць «актыўны адпачынак». І вось героя пасадзілі на капер, і яны пад гэтую песню зрабілі імклівую прагулку па Няве. Крыўдна: песня не гучала па-сапраўднаму. Не ўсе, напэўна, ведаюць, што «Падмаскоўныя вечары» напісаў я для фільма «Спартакіяда народаў СССР». Але пры мантажы адвялі на яе толькі паўмінуты, абарвалі на паўслове. І ў фільме гэту песню не заўважылі...

— Што вы можаце сказаць аб сваёй рабоце з рэжысёрам Уладзімірам Феціным, які паставіў карціны па творах Шолахава?

— Добрая садружнасць нарадзілася з самага пачатку. Я з задавальненнем пісаў музыку да «Жарабяці» і «Данской аповесці». У другім выпадку задача была асабліва цікавая. Злымачная група прывезла з Растоўскай вобласці плёнку з запісамі старых казацкіх песень, надзвычай каларытных. Я выкарыстаў гэтыя запісы ў якасці адпраўнога пункту і мне як быццам удалося захаваць у музыцы лірыка-эпічны стыль казацкіх песень, іх каларыстычнае гучанне. І ў той жа час перадаць, калі можна так сказаць, дыханне вятроў рэвалюцыі, за якую змагаліся героі карціны. У «Жарабяці» перада мной стаяла трохі іншая задача. Калі «Данскую аповесць» можна было смела назваць аптымістычнай трагедыяй, дык «Жарабя» — фільм, напоўнены чайтанчэйшай паэзіяй. Адсюль — і розны падыход да музыкі, хоць у абодвух выпадках — той самы Шолахаў, тое самае казацтва.

— Зараз вы зноў збіраецеся працаваць з Уладзімірам Феціным, на гэты раз над экранізацыяй «Вірыніі» Лідзіі Сейфулінай. Якой уяўляецца вам музыка для гэтага фільма?

— Пакуль можна гаварыць толькі аб агульных адчуваннях. У сувязі з будучай музыкай у мяне ўзнікаюць уражанні, звязаныя з неабсяжнасцю прастораў Расіі, велізарных патэнцыяльных магчымасцей яе народа. Музыка да фільма павінна быць таежная, кражыстая. Я збіраюся шырока выкарыстаць запісы музыкі стараверскай і абрадавай. Лейтматывам будзе тэма Вірыніі, якая пройдзе праз увесь фільм. Неабходна выказаць цэлую гаму самых розных пачуццяў і душэўнага стану гераіні,—а гэта — заўсёды цікавая задача для кампазітара.

Міхаіл ДАЛІНСКІ,
Сямён ЧАРТОК
(АДН).

КАЛЕКЦЫЯНЕР.

Фота У. МЕЗІНА. (БЕЛТА).

ПОЛОТНЫ ВЯРТАЮЦЦА ДА ГЛЕДАЧОЎ

У свой час у шырока вядомай Нясвіжскай карцінай галерэі захоўваўся вялікі збор старадаўніх твораў жывапісу — каля трохсот ці болей палотнаў, якія належалі магнатам Радзівілам. Падзеі другой сусветнай вайны ўварваліся ў лёс гэтага беларускага музея. І сёння прынамсі пра сто пяцьдзесят палотнаў гэтага каштоўнага збору нічога не вядома. Восемдзесят палотнаў у 1951 годзе былі перададзены Беларускім дзяржаўным музеем Вялікай Айчыннай вайны, дзе яны ў той час знаходзіліся. Польскай Народнай Рэспубліцы.

Нядаўна з фондаў Дзяржаўнага музея БССР перададзена ў Дзяржаўны мастацкі музей БССР 65 твораў жывапісу славутага Нясвіжскага збору. Гэта пераважна палотны XVI—XVII стагоддзяў. Сярод іх партрэт вядомай у гісторыі Беларусі княжны Урсулы Радзівіл, стваральніцы тэатра ў Нясвіжы і драматычнай пісьменніцы, партрэты Мікалая Радзівіла, Яна Сабескага, Мікалая Завішы — кашталяна віцебскага, князёўны Бургундскай — жонкі аднаго з Радзівілаў, маршалка і кашталяна віленскага Яна Корбута і інш.

Многія палотны пашкоджаны. Яны будуць адноўлены вопытнымі рэстаўратарамі.

З. ПАЗНЯК.

НЕВЯДОМЫ ПАРТРЭТ ШАЛЯПІНА

Гэты накід алоўкам вялікага рускага спевака, які намаляваў на альбомным лістку свой профіль, знойдзены ў Харкаве. Пад малюнкам подпіс—«Ф. Шаляпін». Над аўтапартрэтам яго рукой напісаны чатыры страфы з вядомай народнай песні «Помню, я еще молодушкой была...» і дата «1 жніўня 910».

Альбом з аўтапартрэтам Шаляпіна, як паведамляе газета «Праўда Украіны», захоўваецца ў сям'і нябожчыка прафесара Харкаўскага політэхнічнага інстытута М. І. Кузняцова. Як расказвае яго дачка Н. Кузняцова, у 1910 годзе Мяфодзій Іванавіч сустракаўся з Ф. І. Шаляпіным у маёнтку «Уцешнае» Кастрамской губерні ў іх агульнага знаёмага А. Шулепнікава. Будучага вучонага-хіміка і геніяльнага артыста аблізіла любоў да жывапісу. На сумесных эцюдах і быў зроблены накід аўтапартрэта.

У сям'і прафесара захоўваюцца таксама унікальныя фатаграфіі Шаляпіна.

АДН.

Экранізацыя «Зорак Эгера»

Буйнейшымі па размаху ў гісторыі венгерскай кінематаграфіі будуць здымкі новага гістарычнага фільма па раману класіка венгерскай літаратуры Гезы Гардоні «Зоркі Эгера». Гэта кніга, перакладзеная на рускую мову, карыстаецца вялікай папулярнасцю і сярод савецкіх чытачоў. Яна адноўлае гераічную старонку гісторыі Венгрыі, расказвае пра абарону эгерскай крэпасці ў часы турэцкага нашэсця.

За выкананне складанай задачы ўзяўся відны венгерскі кінарэжысёр Золтан Варконі. Асноўныя здымкі будуць адбывацца ў ваколіцах Будапешта, дзе ствараецца копія эгерскай крэпасці. Да масавых здымкаў, у якіх павінны быць заняты тысячы людзей, будуць прыцягнуты падраздзяленні венгерскай арміі і ўдзельнікі летніх намсамольскіх лагераў.

Эпізоды, якія (згодна сцэнарыю, які напісаў Іштван Немешкюрці) павінны адбывацца ў Турцыі, мяркуецца здымаць у Балгарыі. Магчыма выкарыстаюць для здымкаў старажытныя крэпасці ў Славакіі і Югаславіі.

У фільме будуць заняты лепшыя артыстычныя сілы краіны. Сярод выканаўцаў роляў — Імрэ Шынковіч, Цібар Бічкеі, Ферэнц Бешэнеі, Вера Венцель.

Будапешт.

А. СЯМЕНАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

2 красавіка

Першая праграма. 10-30 — школьны экран. Для вучняў 8-га класа. Геаграфія. «Сучасная прамысловасць Беларусі і яе асноўныя галіны». 11-00 — «Вясёлка ў чорна-белым». Кінанарыс. 11-30—для школьнікаў. «Вясёлы поезд». Канцэрт выхаванцаў дзіцячых садоў. Перадача з Краснадара. 12-00 — для школьнікаў. Тэлевізійнае агенцтва «Піянерыя» (М). 17-00 — «Навіны». 17-10 — праграма перадач. 17-15—акадэмія сельгаспадарчых ведаў (М). 17-45—для дзяцей. «Раніца з тыграмі». Рапартаж з Дзяржаўнага цырка БССР. 18-30—для слухачоў школ асноў марксізма-ленінізма. Палітэканомія сацыялізма. «Сусветная сацыялістычная сістэма гаспадаркі». Гутарка першая (М). 19-00 — «Навіны». 19-10—«На падмостках сцэны». Мастацкі фільм. 20-45—інфармацыйная праграма «Час» (М). 21-30—«Юбілейнаму году — высокі ўраджай». Радыётэлевізійная перакліча хлебаробаў распублікі (Гродна). 22-00—да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Старонкі кіраленіняны. «Жывы Ленін». Дакументальны фільм. 22-25—«Мелодыі-66». Фільм-канцэрт. 23-10 — «Толькі факты». Праграма перадач. «Музычны маяк». Экран — завочнікам. 23-25 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Сапрамат».

Другая праграма. 10-05—тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — «Ла новых берагоў» (М). 17-45— «Кампазітары Грузіі—дзецям». Канцэрт для школьнікаў (М). 18-30 — «Чырвонае Сормава». Кінанарыс. 19-00 — «Васа Жалязнова». Мастацкі фільм (М). 20-45—наш кінаглобус «Зямля рук». Кінанарыс. 21-15—рэкламы, аб'явы. 21-30 — сімфанічны канцэрт (М). 22-25—«Веды». Навукова-пазнавальная праграма.

3 красавіка

Першая праграма. 10-05—тэлевізійныя навіны (М). 10-15— «Мелыцынскія парады» (М). 10-30—для школьнікаў. «Табе, юнацтва!». Перадача з Адэсы. 11-00—«Вясновыя напевы». Музычная праграма (М). 15-45 — «Навіны». 15-55—праграма перадач. 16-00 — школьная фільматэка. «Хто вінаваты?». Тэлевізійны спектакль. 18-00—«Расказы пра гераізм». Выступленне пісьменніка С. С. Смірнова (М). 18-30—«Юбілейнаму году— высокі ўраджай». Радыётэлевізійная перакліча хлебаробаў рэспублікі (Гомель). 19-00 — «Дарагі мой друг». Мастацкі фільм. 20-10—«Навіны». 20-25 — «На музычнай хвалі». 20-30— Інфармацыйная праграма «Час» (М). 21-15—«Мерыдыяны дружбы». Да Дня нацыянальнага свята ВНР. 21-35 — «Батумскі батанічны сад». Кінанарыс. 21-55 — «Праз дзесяць гадоў...» Пра першых выпускнікоў факультэта графікі Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута. 22-15 — «Наша пошта». Юрыдычная кансультацыя. 22-25 — «Папулярная песня 1968 года». Перадача з Берліна. 23-25 — праграма перадач.

Другая праграма. 17-05—тэлевізійныя навіны (М). 17-15— «Лірычны настрой». Канцэрт мастацкай самадзейнасці (М). 18-00—«Нам—семнаццаць». Тэлевізійны фільм. 18-30 — «Прапагандыст». Тэлевізійны часопіс (М). 19-00—«У пастцы». Прэм'ера тэлевізійнага мастацкага фільма (М). 20-10 — «Старонкі музычнага календара» (М). 20-30—«Іх жыццё — подзвіг». «Дэлегат Урала». «Наш Ваня». Кінанарысы. 21-15—кінаграма.

4 красавіка

Першая праграма. 10-05—тэлевізійныя навіны (М). 10-15— «У пастцы». Тэлевізійны мастацкі фільм (М). 11-25—«Горкі ў Грузіі». Перадача з Тбілісі. 17-00—«Навіны». 17-10—праграма перадач. 17-15—да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Старонкі кіраленіняны. «Зімовыя вечары». Тэлевізійны фільм. 17-35 — «На музычнай хвалі». 17-45 — «Насельніцтву пра грамадзянскую абарону» (М). 18-00—«Юбілейнаму году— высокі ўраджай». Радыётэлевізійная перакліча хлебаробаў рэспублікі (Брэст). 18-30—«Рубеж—300 мільёнаў тон». (Уключэнне Мінска) (М). 19-00—І. Ларваш. «Пажар на світанні». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Да нацыянальнага свята ВНР (М). 20-30—інфармацыйная праграма «Час» (М). 21-15—для старэйшых школьнікаў. «Перад экзаменамі». Парады настаўніку выпускнікам сярэдняй школы. 21-45—«На музычнай хвалі». 21-55—насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Заўтра нашай рэспублікі». Інтэрв'ю з міністрам камунальнай гаспадаркі БССР У. Б. Труновым. 22-25—канцэрт венгерскай музыкі. 23-00—«Толькі факты». Праграма перадач. «Музычны маяк».

Другая праграма. 17-05—тэлевізійныя навіны (М). 17-15— «Сельская навіна» (М). 17-45— «Тайна знікаючых рэк». Кінанарыс. 18-00—для школьнікаў. Канструктарскае бюро «Самадзелка» (М). 18-30 — дзіцячы экран. «Кот—кніганоша». Тэлевізійны фільм. «Вясёлы рамок». Фільм-канцэрт. 19-15 — «Зачараваны вандроўнік». Тэлевізійны спектакль. 21-15—музычны антракт (М). 21-30—«Будапешт у суботу і нядзелю». Тэлевізійны фільм (М). 22-00—«Паплам». Сумесная савецка-венгерская вясёлая праграма (М).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН (намеснік галоўнага рэдактара), А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-